КАМУ ПРЫПЫНАК ПЕРАШКАДЖАЕ?

4

ГІСТОРЫЯ Ў СКЛЯПАХ І ЭКСПАНАТАХ

12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

19 САКАВІКА 2024 г. АЎТОРАК № 55 (30189)

КАРОТКА

- **Вярхоўны Суд Беларусі прызнаў Уладзіміра Катрука, вядомага як кат Хатыні, вінаватым у здзяйсненні генацыду.**
- БУТБ плануе павялічыць экспарт беларускай сельгаспрадукцыі ў Манголію.
- **Пасажыраабарот у Беларусі ў студзені—лютым павялічыўся на 8,3 працэнта.**
- Абмежаванні на наведванне лясоў уведзены ў пяці раёнах Беларусі.
- **Узбекская авіякампанія павялічвае частату рэйсаў у Мінск.**
- ВУП Беларусі ў студзені—лютым вырас на чатыры працэнты.

ЦЫТАТА ДНЯ

Намеснік генеральнага пракурора Аляксей СТУК *(пра абвінаваўчы прысуд, вынесены ўчора кату Хатыні Катруку):*

«Нам важна спыніць усялякія маніпулятыўныя развагі адносна калабарацыянізму. Іх нельга лічыць змагарамі за нацыянальную ідэю, гэта здраднікі Радзімы, гэта варвары, забойцы. Аднаму з іх сёння дадзена прававая ацэнка. І сапраўдны судовы працэс будзе адным з фактараў і важным момантам у спыненні ўсякага талерантнага стаўлення да нацызму і фашызму. Вынесенае рашэнне — не што іншае як рэалізацыя бясспрэчнага пастулата: ніхто не забыты, нішто не забыта. «Ніхто» — гэта наш народ, ахвяры, яго подзвіг, а «нішто» — гэта злачынствы і варварствы тых, хто паўстае перад судом».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ГЭТА І ЎРАЧЫСТА ПАВІННА БЫЦЬ, АЛЕ І САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — ЗМЯСТОЎНА»

Аляксандр Лукашэнка паставіў задачы па правядзенні Усебеларускага народнага сходу

Рабочы тыдзень Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі пачаўся з найважнейшых палітычных тэм. Перад нарадай па пытаннях падрыхтоўкі да правядзення пасяджэння Усебеларускага народнага сходу кіраўнік дзяржавы правёў тэлефонную размову са сваім расійскім калегам. Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і ад сябе асабіста павіншаваў Уладзіміра Пуціна з перамогай на выбарах. Падрабязнасці гэтай размовы ён расказаў на старце нарады, удзел у якой узялі прэм'ер-міністр, кіраўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта і Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, Старшыня Савета Рэспублікі і начальнік сакратарыята УНС.

СТАР. 2

Фота БелТА.

На старце!

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

За падзеямі на касмадроме Байканур «Звязда» будзе сачыць вачыма, дакладней, праз аб'ектыў фотакарэспандэнта Віктара ІВАНЧЫКАВА, які знаходзіцца непасрэдна на месцы падзей — на Байкануры. Сачыце за публікацыямі ў наступных нумарах, а таксама на нашым сайце zviazda.by.

Падрыхтоўка да старту транспартнага пілатаванага карабля «Саюз МС-25» падышла да завяршэння. Учора на адной з пляцовак касмадрома Байканур ракету-носьбіт карабля «Саюз-2.1а» вывезлі з мантажна-выпрабавальнага корпуса і ўстанавілі на старт. Ужо зусім хутка, 21 сакавіка, роўна ў 16.21 па беларускім часе, экіпаж 21-й экспедыцыі наведвання адправіцца на Міжнародную касмічную станцыю. У складзе экіпажа — і беларуска Марына Васілеўская, якая праходзіць перыяд абсервацыі на Байкануры. Яна адправіцца на МКС разам з касманаўтам «Раскосмасу» Алегам Навіцкім і астранаўтам НАСА Трэйсі Дайсан.

Вясновы рэпартаж

СОК З ДАСТАЎКАЙ І З ЛЕДЗЯШАМІ

Як мы бярозавік куплялі на гандлёвай пляцоўцы лясгаса і ў лясніцтве

Для мяне ўжо шмат гадоў прыход вясны асацыюецца з магчымасцю выпіць кавы, звараную на бярозавым соку. Даволі даўно адна нарыхтоўшчыца бярозавіку пачаставала такой, з таго часу заўсёды чакаю пару, якая дае магчымасць смакаваць асабліва духмяны чай альбо каву на соку. Чароўным атрымліваецца напой, калі сок закіпіць на кастры: кава на свежым паветры з водарам вясновага лесу. Але і дома на пліце можна згатаваць, таксама будзе смачна.

СТАР. 4

«ГЭТА І ЎРАЧЫСТА ПАВІННА БЫЦЬ, АЛЕ І САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — ЗМЯСТОЎНА»

«Галоўны ўрок — нашым народам нельга навязваць чужую волю»

Аляксандр Лукашэнка перадаў словы падзякі Уладзіміра Пуціна ўсім, хто дапамагаў арганізоўваць выбары Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі на тэрыторыі Беларусі. «Выбары прайшлі як нідзе арганізавана, як не спрабавалі нас тут хістаць і з захаду, вельмі добрыя вынікі. Пасольства Расіі вельмі добра працавала ў кантакце з нашымі службовымі асобамі, таму я перадаю вам падзяку за работу і арганізацыю выбараў Прэзідэнта Расіі на тэрыторыі Беларусі», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы назваў вынік прэзідэнцкіх выбараў у Расіі ашаламляльным: «Цяжка было ўявіць. 87,3 працэнта ад тых, хто прыйшоў, аддалі свае галасы дзеючаму прэзідэнту. Вынікі вельмі сур'ёзныя, але і яўка ж высокая была. Ніколі такой яўкі ў Расіі не было. Таму пры высокай яўцы такія вынікі ў нейкай ступені нават нечаканыя. Гэта мая пазіцыя была, і я яе выказаў».

Беларускі лідар падкрэсліў, што з любых падзей трэба выносіць пэўныя ўрокі. «Самы галоўны ўрок у тым, што нашым народам нельга навязваць чужую волю. Калі ты будзеш спрабаваць гэта зрабіць — людзі зробяць наадварот, як бы ні было складана. Таму не атрымалася ў вядомых сіл навязаць гэту волю, расіянам у першую чаргу. Яны малайцы, згуртаваліся ў гэты выбарчы і перадвыбарчы перыяд і паказалі, хто ў доме гаспадар», — канстатаваў ён. Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што такі вынік выбараў — сур'ёзны сігнал Захаду, які рабіў стаўку на тое, каб расхістаць знутры Расію. Не атрымліваецца на фронце — значыць расхістаць знутры. Таксама не атрымалася, заўважыў ён. «Трэба разумець, што гэта і для нас навука. Мы напярэдадні 2025 года, нашых выбараў. Трэба пільна вывучыць падрыхтоўку гэтых выбараў. Трэба сказаць, што Адміністрацыя Прэзідэнта Расіі бліскуча арганізавала сам працэс, быў спланаваны перадвыбарчы перыяд. Натуральна, Прэзідэнту шмат прыйшлося працаваць, вы гэта бачылі, неймаверна шмат. Ён малайчына, ён аб'ехаў усю Расію, пабываў у розных пунктах і адказаў на актуальныя пытанні расійскага грамадства. Вельмі добрае было планаванне перадвыбарчага працэсу і сам ход выбарчай кампаніі. Ёсць чаму павучыцца. Усе патрыятычна выступілі і выдалі цудоўны вынік. Таму для нас гэта ўрок», — падсумаваў беларускі лідар.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па яго словах, сёння трэба працаваць на тое, каб беларусы былі ўключаны ва ўсе праграмы, якія Прэзідэнт Расіі агучваў у пасланні расійскаму народу. Аляксандр Лукашэнка назваў гэтыя планы вельмі цікавымі. Некаторыя ўжо рэалізоўваюцца. «Аб'ём гэтых планаў каля дзевяці трыльёнаў рублёў. І ён (Уладзімір Пуцін. — **«Зв.»**) сказаў, што з вялікім задавальненнем будзе вітаць работу беларусаў па рэалізацыі гэтых планаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Сярод гэтых планаў, напрыклад, будаўніцтва хуткаснай дарогі ад Масквы праз Мінск да Брэста. «Плануецца вялікая работа. Але нам трэба будзе прайсці і свае выбары ў 2025 годзе», — падсумаваў беларускі лідар.

«Усё цяпер сканцэнтравана палітычна на нас»

Вяртаючыся да галоўнай тэмы нарады — правядзення пасяджэння Усебеларускага народнага сходу, Прэзідэнт заўважыў, што ўпершыню гэтаму органу нададзены канстытуцыйны статус. Ужо пачалося вылучэнне кандыдатаў у дэлегаты УНС, створаны аргкамітэт пад старшынствам прэм'ер-міністра Рамана Галоўчанкі.

«Так, гэта сёмае скліканне, можна сказаць, але яно асаблівае. Яно канстытуцыйнае. Таму вельмі важна і знешне, і па змесце правесці яго на самым высокім узроўні. Ведаю, што вы двойчы абмяркоўвалі гэтыя пытанні, выйшлі на канкрэтныя рашэнні і прапануеце сёння іх абмеркаваць на маім узроўні. Вызначыліся па фармаце правядзення Усебеларускага народнага сходу. Дэталі давайце абмяркуем, але яшчэ раз паўтару, што гэта і ўрачыста павінна быць, але і самае галоўнае — змястоўна. Каб было, як выбары ў Расіі, камар носа не падтачыў, каб нас потым не папракалі. Усё цяпер сканцэнтравана палітычна на нас. У Расіі бурных падзей не плануецца, вакол — таксама. Засталося ў нас правядзенне Усебеларускага народнага сходу. Стаўкі асобных збеглых нашых і Захаду на тым, каб пастарацца як мага больш прынесці дэзарганізацыю і развал падчас пасяджэння і прыняцця рашэнняў. Мы такога падарунка ім зрабіць не павінны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка далажыў, што арганізацыйны камітэт па правядзенні пасяджэння Усебеларускага народнага сходу пачаў сваю работу і разглядае ўвесь спектр пытанняў. «Усе зацікаўленыя накіраваны на тое, каб дакладна і годна правесці гэта значнае для беларускай дзяржаўнасці мерапрыемства. Гэта першае пасяджэнне УНС у новым статусе, і яно будзе адрознівацца і ад усіх папярэдніх, і ад наступных з улікам неабходнасці правядзення шэрагу ў першую чаргу выбарчых працэдур, якія прадугледжаны законам», — сказаў ён. Кіраўнік урада адзначыў, што фарміраванне складу УНС праходзіць планава. Таксама Раман Галоўчанка далажыў Прэзідэнту аб бягучай сітуацыі ў падрыхтоўцы і тых падыходах, якія выпрацаваны па асобных момантах, па якіх неабходна прыняць рашэнне.

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ У тэму

Усебеларускі народны сход пройдзе 24—25 красавіка

У размове з журналістамі **прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Раман ГАЛОЎЧАНКА** адзначыў, што падрыхтоўка да правядзення пасяджэння УНС ідзе паводле плана і даклад Прэзідэнту быў таксама планавы. «Вырашылі параіцца з Прэзідэнтам па шэрагу пытанняў, звязаных з правядзеннем пасяджэння УНС. У асноўным гэта арганізацыйна-пратакольныя моманты, бо Прэзідэнт абсалютна справядліва паставіў задачу зрабіць першае пасяджэнне УНС у канстытуцыйным статусе асабліва ўрачыстым, значным і запамінальным. Намі былі парыхтаваны разнастайныя варыянты афармлення залы, знакаў дэлегатаў УНС і іншыя пытанні, па якіх мы параіліся з Прэзідэнтам. У цэлым усе нашы прапановы прынятыя», — расказаў Раман Галоўчанка.

Асобна журналісты пацікавіліся парадкам дня пасяджэння Усебеларускага народнага сходу. Прэм'ер-міністр адзначыў, што праект парадку дня гатовы, але ён можа быць дапоўнены пэўнымі пытаннямі з тых паўнамоцтваў, якія па законе і па Канстытуцыі мае УНС.

Ужо вядома дата правядзення пасяджэння Усебеларускага народнага сходу — 24—25 красавіка. «У першы дзень, у асноўным, будуць разглядацца пытанні арганізацыйна-выбарчага характару, таму што пасяджэнне асабліва. Трэба будзе рэалізаваць шэраг працэдур, які прама прадугледжаны законам. Трэба будзе выбраць рабочыя органы Усебеларускага народнага сходу: старшыню, намесніка старшыні УНС, Прэзідыум УНС. Таксама трэба будзе прыняць часовы рэгламент работы УНС і шэраг іншых працэдур. Першы дзень будзе прысвечаны важным пытанням, неабходным для далейшага функцыянавання гэтага органа. А ў другі дзень будуць разглядацца пытанні, якія ўключаны ў парадак дня», — адзначыў Раман Галоўчанка.

Усе працэдуры па выбранні дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу будуць праведзены з 1 да 10 красавіка. Такім чынам, па словах прэм'ер-міністра, з 10 да 15 красавіка стануць вядомыя прозвішчы дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. «Гэта будзе першае пасяджэнне УНС у канстытуцыйным статусе. Думаю, мы правядзём яго на добрым узроўні, які запомніцца і дэлегатам, і тым, хто будзе назіраць за яго правядзеннем», — падсумаваў прэм'ер-міністр.

Блізкая ўлада

Верф для «Брыганціны»

З якімі пытаннямі прыйшлі людзі да старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра СУБОЦІНА

Жыхар паўночнай сталіцы расказаў аб рэканструкцыі аб'екта на праспекце Будаўнікоў. У старым будынку бацька з сынам плануюць аднавіць кінатэатр «Брыганціна» ў яго першасным выглядзе. Мужчына шукаў падтрымку ў гарадской улады і спытаў у губернатара, ці патрэбен Віцебску кінатэатр, які на працягу трох гадоў рэканструюецца за сродкі ўласніка. Аляксандр Міхайлавіч адказаў, што новы кінатэатр у густанаселеным мікрараёне віцябчанам патрэбны, тым больш што на прэм'еры ў двух іншых установах бывае цяжка знайсці квіткі.

Фота БелТА.

Мікрараён новай забудовы «Арэхава» дагэтуль вызывае пытанні ў яго жыхароў. Спачатку былі праблемы з тэрмінамі здачы неабходных камунікацый, а цяпер заяўніцы прыйшлі са скаргамі на нездавальняльны стан дарог. Праз ямы і раскіслую глебу шматдзетныя сем'і не могуць вадзіць дзяцей у садок або праязджаць на аўтамабілях да сваіх дамоў. Старшыня Віцебскага гарвыканкама Генадзь Сабыніч паабяцаў, што вада будзе адпампавана, пасля чаго запусцяць сістэму водаадвядзення. Плануецца, што работы завершацца ў трэцім квартале бягучага года. У найбліжэйшыя месяцы, калі зямля падсохне, тэхніка выйдзе ў мікрараён, каб пабудаваць каналы.

З праблемай сырасці ў кватэры па вуліцы Суворава да Аляксандра Субоціна звярнулася пажылая віцябчанка. У яе доме затаплівае падвал, праз гэта ў кватэру паўзае цвіль. Праз асабістую праблему заяўніца выказала і клопат аб добраўпарадкаванні прыдамавой тэрыторыі і пешаходнай вуліцы ў гістарычнай частцы горада. Кіраўнік вобласці ўзяў зварот грамадзянкі на асабісты кантроль і прапанаваў правесці суботнік разам з усімі жыхарамі дома, папрацаваць талакой для саміх сябе.

Не першы раз з пытаннем неналежнай вентыляцыі ў шматкватэрным доме на Маскоўскім праспекце звяртаецца жыхарка абласнога цэнтра. Па яе словах, у доме, якому ўжо амаль паўвека, не было праблем да таго часу, пакуль на першым паверсе не адкрылася цырульня. Як сцвярджае заяўніца, яе ўласнікі не падумалі аб пабудове асабістай для цырульні вентыляцыі, цяпер усе пахі фарбы і хімічных сродкаў для догляду за валасамі ідуць у яе кватэру. Аляксандр Міхайлавіч даручыў адказным службам выявіць і ліквідаваць прычыну спецыфічных пахаў у жылых кватэрах.

Таксама старшыня аблвыканкама разгледзеў пытанні арганізацыі гандлю, догляду дарог і нават узаемаадносін паміж людзьмі. «Часам людзі прыходзяць з праблемамі невырашальнымі, таму што яны ляжаць у плоскасці міжасобасных канфліктаў, калі ўжо ўсе заканадаўчыя нормы вычарпаныя, ёсць рашэнне суда, але чалавек незадаволены. Гэтыя праблемы самыя складаныя. Працэнтаў 70 зваротаў датычацца інфраструктуры, рамонту. Дзесьці работа затрымліваецца праз недахоп фінансавання ці таму, што аб'ект стаіць у чарзе на пазнейшыя тэрміны, а грамадзянам хочацца, каб было хутчэй. Дзесьці чыноўнікі не вераць, што праблема ёсць. Такія пытанні не павінны даходзіць да кабінетаў абласной улады, яны павінны вырашацца на самым нізкім узроўні. Я спадзяюся, што ўсе мы, кожны на сваім месцы, будзем вырашаць гэтыя праблемы, і зваротаў будзе менш», — падсумаваў Аляксандр Субоцін.

Аляксандра Гвоздзева.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Улады Нігера разарвалі ваеннае пагадненне з ЗША

Ваенныя Нігера, што знаходзяцца ва ўладзе, разарвалі пагадненне з ЗША, якое дазваляе амерыканскім вайскоўцам знаходзіцца на тэрыторыі афрыканскай краіны. Аб гэтым паведаміла агенцтва Reuters са спасылкай на афіцыйнага прадстаўніка ваеннага пераходнага ўрада Нігера Аматду Абдрамана. Рашэнне было прынята пасля візіту амерыканскіх чыноўнікаў, у прыватнасці памочніка дзяржсакратара ЗША па справах Афрыкі Молі Фі і кіраўніка афрыканскага камандавання Пентагона Майкла Лэнглі. Афіцыйны прадстаўнік ваеннага пераходнага ўрада Нігера заявіў у выступленні, што амерыканская дэлегацыя парушыла дыпламатычны пратакол і ўлады Нігера не праінфармавалі аб складзе дэлегацыі, даце яе прыбыцця або парадку дня. Паводле даных Reuters, летась у Нігеры знаходзілася каля 1,1 тысячы амерыканскіх вайскоўцаў і амерыканская база беспілотнікаў.

Еўракамісія гатова пайсці на ўступкі фермерам

Улады Еўрапейскага саюза гатовы пайсці на ўступкі вытворцам сельгаспрадукцыі і адкласці ўкараненне шэрагу норм, у тым ліку якія датычацца барацьбы са змяненнем клімату, перадае Euronews. Еўрапейская камісія прапанавала перагледзець некаторыя палажэнні Адзінай сельскагаспадарчай палітыкі, каб палегчыць жыццё фермерам, «захаваўшы пры гэтым моцную, устойлівую і канкурэнтаздольную палітыку для сельскай гаспадаркі і харчавання ЕС». Паводле слоў прадстаўнікоў Еўракамісіі, гэта «прамы адказ на сотні запытаў, атрыманых ад арганізацый, якія прадстаўляюць фермераў, і краін-членаў Еўрасаюза». Аднак такі адказ не ўсім даспадобы. «Гэта задавальняе пэўную колькасць сіндыкатаў аграбізнесу, якія хочуць і далей быць канкурэнтаздольнымі на міжнародных рынках, ахвяруючы пры гэтым здароўем фермераў, а таксама абаронай навакольнага асяроддзя», — заявіла каардынатар сялянскай арганізацыі Via Campesina і фермер Морган Одзі.

Колькасць тых, хто заразіўся ліхаманкай дэнге, у Бразіліі ўжо больш, чым за ўвесь мінулы год

Паводле даных даклада Міністэрства аховы здароўя Бразіліі, колькасць выпадкаў заражэння ліхаманкай дэнге з пачатку бягучага года склала 1,68 мільёна, што перавышае паказчык папярэдняга года. Пра гэта паведаміла ТАСС. Цяжкая форма ліхаманкі выяўлена ў больш як 14,5 тысячы чалавек. Пацверджана 513 выпадкаў смяротнага зыходу, 908 знаходзяцца ў стадыі вывучэння. На працягу мінулага года ў Бразіліі было зарэгістравана звыш 1,65 мільёна выпадкаў дэнге — віруснай інфекцыі, якая часцей за ўсё сустракаецца ў трапічных і субтрапічных раёнах.

Гарадское асяроддзе

Свята працы аб'ядноўвае пакаленні

Больш чым 120 тысяч чалавек са звыш 200 прадпрыемстваў і арганізацый выйшлі на добраўпарадкаванне роднага горада падчас суботніка ў Гомелі. Агульнымі сіламі гамяльчан зароблены мільён рублёў. Сабраныя сродкі накіруюць на добраўпарадкаванне Дошкі гонару горада Гомеля, а таксама ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў сацыяльнай сферы горада.

ПРАПАНОВЫ МОЛАДЗІ

Прадстаўнікі ўлады, кіраўніцтва і члены працоўных калектываў арганізацый і прадпрыемстваў усіх форм уласнасці горада, моладзь, жыхары мікрараёнаў жылой забудовы наводзілі парадак у парках, скверах, месцах масавага адпачынку, на прылеглых тэрыторыях установ.

Традыцыйна асаблівая ўвага жыхароў Гомеля — добраўпарадкаванню памятных месцаў, воінскіх пахаванняў. Маладзёжны працоўны дэсант разам са старшынёй Гомельскага гарвыканкама Уладзімірам Прывалавым правялі суботнік на алеі Герояў. Тут высадзілі больш за 100 каштанаў. Падтрымаў ініцыятыву знакаміты гамяльчанін — сын аднаго з кіраўнікоў гомельскага партыйнага падполля падчас Вялікай Айчыннай вайны Рамана Іларыёнавіча Цімафеенкі — Расціслаў Цімафеенка. Актыўны ўдзельнік патрыятычных сустрэч са школьнікамі і моладдзю, былы выкладчык кафедры філасофіі і гісторыі паліталогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту, Расціслаў Раманавіч заклікаў маладыя пакаленні любіць родны горад, захоўваць памяць аб яго мінулым.

Пасля пасадкі дрэў на Алеі Герояў прайшла імправізаваная дыялогавая пляцоўка кіраўніцтва горада з моладдзю. Уладзімір Прывалаў заклікаў актыўных маладых гамяльчан далучацца да новага праекта з нагоды 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, які цяпер распрацоўваецца ў Гомелі, і дасыпаць свае прапановы ў гарвыканкам.

ПРЫБОРКА ТАЛАКОЙ

Актыўны ўдзел у марафоне прыняў дэпутацкі корпус Гомеля. Дэпутаты Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў выйшлі на добраўпарадкаванне тэрыторыі аздараўленчага лагера «Луч».

У Савецкім раёне Гомеля ў суботніку ўзялі ўдзел калектывы Гомельскіх электрычных сетак, «Гомельгаз», Гомельскага дома-будаўнічага камбіната, ААТ «Мілкавіта». Прадпрыемствы таксама дапамаглі з тэхнікай — пагрузчыкамі і самазваламі.

Калектыў прадпрыемства «Мілкавіта» на гарадскі суботнік выйшаў усім складам. Супрацоўнікі наводзілі парадак на прылеглай тэрыторыі завода, прыбіралі зялёную зону, бялілі бардзюры і дрэвы.

— Наводзіць парадак талакой на карысць сваёй Радзімы — гэта правільна, бо якім будзе наш раён, горад і вобласць залежыць ад нас саміх, — падзялілася падчас суботніка нядаўняя пераможца конкурсу «Місіс Мілкавіта» інжынер вытворчай лабараторыі прадпрыемства Алена Куляўцова.

БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

Каб усе ахвотныя гараджане змаглі далучыцца да суботніка, у Гомелі загадзя аб'явілі тэлефоны гарачых ліній для кожнага раёна. Вельмі актыўна гамяльчане падтрымалі навядзенне парадку на тэрыторыях новых мікрараёнаў жылой забудовы Хутар, Паўднёвы, Шведская горка. Жыхары новабудоўляў сем'ямі выходзілі на суботнік.

У Чыгуначным раёне члены аднаго з жыллёва-будаўнічых вытворчых кааператываў па вуліцы Народнага Апалчэння пад кіраўніцтвам свайго старшыні актыўна папрацавалі на дваровай тэрыторыі. Прыбіралі лістоту, сухія галінкі, рамантавалі пясочніцу, акультурвалі клумбы. Актыўна дапамаглі бацькам і дзеці. Жыхары дома працуюць на сваёй тэрыторыі заўсёды, з радасцю падтрымліваюць усе агульнагарадскія ініцыятывы па навядзенні парадку.

На тэрыторыі парку Фестывальны, што ў Савецкім раёне Гомеля, у поўным складзе на суботнік выйшлі некалькі шматдзетных сем'яў. Дружна працавалі разам з мамай Дзянай яе чацвёра дзяцей — Міраслава, Сафія, Цімур і Уладзіслаў.

— Я сама заўсёды актыўна прымаю ўдзел у суботніках і дзяцей прывучаю да гэтага, — падзялілася Дзіяна Анатольеўна.

Папрацаваць на суботніку ў парк прыйшла і сям'я Малеевых.

— Мы жывём у пяціпавярховым доме на Рэчыцкім праспекце. Імкнёмся падтрымліваць парадак у пад'ездзе, каля дома, — расказала вялікае сямейства.

З САМАВАРАМ І БЛІНАМІ

У Савецкім раёне дружна, з самаварам, выйшлі на добраўпарадкаванне сквера «Кірмашаўскі» калектыў прадпрыемства «Кірмаш» і актыўныя гараджане. Сквер знаходзіцца побач з жылымі дамамі. Ён вельмі папулярны ў жыхароў раёна. Летась падчас рэспубліканскага суботніка дэпутаты Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў тут устанавілі абсталяванне для заняткаў фізічнай культурай і спортам. Яго сваімі сіламі вырабілі супрацоўнікі прадпрыемства «Кірмаш». Цяпер падчас агульнагарадскога суботніка ў скверы працаўнікі «Кірмаша» і жыхары раёна ўладкавалі пешаходныя дарожкі, прыбралі тэрыторыю.

На суботнік з пачастункам — масленічнымі блінамі — выйшлі ветэраны працы ААТ «Гомельшкло». Так заслужаныя працаўнікі прадпрыемства вырашылі падтрымаць працоўны дэсант маладых працаўнікоў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара і newsgomel.by.

Віртуальны гандаль

У СЕЦІВЕ ВЫКРЫВАЮЦЦА ФАКТЫ «ШЭРАЙ» РЭКЛАМЫ АЛКАГОЛЮ

У сувязі з гэтым МАРГ актывізавала праверкі інтэрнэт-крам

Як паведамляе прэс-цэнтр Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, гэта ведамства правяло аналіз больш чым пяцідзесяці анлайн-магазінаў у рамках нагляду за іх камерцыйнай дзейнасцю.

Даследаванне выявіла каля 40 выпадкаў парушэнняў, звязаных з няпоўным інфармаваннем пакупнікоў аб прадаўцах, умовах куплі, аплаты і дастаўкі тавараў, а таксама з публікацыяй нелегальнай рэкламы алкаголю і тытунёвых вырабаў. Вінаватым бакам былі выдадзены ўказанні па выпраўленні парушэнняў і папярэджанне аб магчымых санкцыях за невыкананне прадпісанняў.

Дадаткова гэта міністэрства праінспектавала найбуйнейшыя анлайн-платформы і выявіла парушэнні ў працэсе продажу тавараў у інтэрнэце. Працэс ліквідацыі парушэнняў будзе працягнуты, і пытанне аб захаванні заканадаўства ў галіне гандлю, абароны правоў спажыўцоў і рэкламы пры анлайн-продажах уключана ў комплексны план маніторынгу міністэрства на 2024 год.

На адным з мясцовых форумаў аперацыйны дырэктар Ozon для СНД Аляксей Сапон адзначыў, што колькасць беларускіх прадпрымальнікаў, якія займаюцца анлайн-гандлем не толькі на мясцовым, але і на міжнародных рынках, дасягнула трох з паловай тысяч, што ў пяць разоў больш у параўнанні з мінулым годам. Прадстаўнік кампаніі прагназуе будучы рост рынку. Чакаецца, што аб'ём продажаў на маркетплейсах у Беларусі дасягне 2,2 мільярда долараў, што перавысіць бягучы паказчык у адзін мільярд долараў.

«З года ў год у спажыўцоў сфарміраваўся пэўны трэнд на спажыванне тавараў, выкарыстоўваючы анлайн-камерцыю. Мы бачым гэта так: большую частку займаюць тавары для дома (гэта каля 18 %), далей ідуць бытавая тэхніка і электроніка (14-16 %), «аўтамабільныя» тавары (12 %), адзенне (трыкатажныя вырабы) і верхняя вопратка па 3 % у кожным сегменце. І застаецца вялікая доля так званых іншых тавараў. Яна займае каля 30 %. Што датычыцца іншай статыстыкі, то, па наяўных у нас даных, — а гэта 2023 год — колькасць зарэгістраваных інтэрнэт-крам была каля 30 000. Таксама, па даных даследаванняў Statista, да 2028 года сусветны рынак анлайн-шопінгу дасягне 40 %. Праз чатыры гады практычна кожны другі пакупнік будзе здзяйсняць анлайн-пакупкі. Сёння такія пакупкі выбірае трэць насельніцтва планеты», — пракаментаваў Артур Англевіч, прадстаўнік кампаніі інтэрнэт-плацяжоў у Беларусі Assist Belarus.

Сяргей КУРКАЧ.

Надвор'е

ВЯСНА ВЯРТАЕЦЦА

Праз пару дзён пачне цяплець

З цяплом у нас нармальна, а вось з дожджыкам праблема. За першыя 17 дзён сакавіка на большай частцы тэрыторыі краіны сума ападкаў склала ад 8 % да 36 % нормы першага вясновага месяца, месцамі па поўдні выпала ад 48 % да 64 % сярэдніх шматгадовых значэнняў, і толькі на метэастанцыі Палеская колькасць ападкаў склала 25 міліметраў, або 84 % месячнай нормы. У нашай краіне пацяплее ў другой палове тыдня, у гэты час пад уплывам франтальных раздзелаў і няўстойлівых паветраных мас будуць адзначацца ападкі рознай фазы і інтэнсіўнасці, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У аўторак надвор'е ў краіне будуць вызначаць вобласць паніжанага атмасфернага ціску і атмасферныя франты. Воблачна з прасненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу, магчымы мокры снег. Ноччу і раніцай у асобных раёнах краіны чакаюцца слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночны, паўночна-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла, удзень — 4—9 градусаў вышэй за нуль. Вецер пераменных напрамкаў умераны.

У сераду месцамі па Беларусі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Ноччу і раніцай у асобных раёнах магчымы туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер пераменных напрамкаў умераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — 4—10 цяпла.

А ў чацвер будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах магчымы туман і слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — 6—12 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, у пятніцу і ў выхадныя стане цяплей, але ў начныя гадзіны ў апошні працоўны дзень на гэтым тыдні будзе падмарожваць. 22 сакавіка месцамі па краіне пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 5, пры прасненнях — да мінус 3 градусаў. Днём будзе 6—13 цяпла.

Доўгачаканыя дажджы прыйдуць да нас 23—24 сакавіка. У суботу і нядзелю на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дастаткова сур'ёзныя ападкі. Ноччу і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 градусаў вышэй за нуль, а ўдзень усё тыя ж 6—13 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

СОК З ДАСТАЎКАЙ І З ЛЕДЗЯШАМІ

У ГОРАДЗЕ

Адным словам, мы накіраваліся за бярозавікам, як толькі з'явіліся паведамленні-запрашэнні на сайтах лясгасаў. Тым больш што другі год запар сок прадаюць на гандлёвай пляцоўцы Брэсцкага лясгаса па вуліцы Кобрынскай, і вітамінны прадукт можна купіць, не выязджаючы з горада.

Як сказана на сайце, папярэдне я патэлефанавала па нумары, які быў указаны. У адказ адразу запрасілі пад'язджаць. Справа была ў мінулую пятніцу, бліжэй да абедзеннага перапынку. Пад'ехалі прыкладна ў 13.15. У чарзе за сокам стаяла каля дзясятка чалавек. І калі летась пластыкавыя ёмістасці па тоне вагой размяшчаліся проста ў кузаве магутнага МАЗа, то цяпер для іх змайстравалі адмысловы паддон-падстаўку. Апошняе вызваліла машыну, якая можа зрабіць некалькі рэйсаў за дзень. Сведчанне таму — яшчэ два аграмадныя «бідоны» збоку ў запасе.

Прыветлівы супрацоўнік лясгаса Давід Шаўшышвілі рэкламуе сваю прадукцыю: «Сок найсвяжэйшы. Толькі ранкам забралі ад дрэў. Усяго трэці дзень гандлюем. Першы сок — самы лепшы. Калі ўжо ідзе нарыхтоўка тыдзень-два, сок становіцца крыху іншы на смак, не такі празрысты. Хоць гэта і не страшна, але ж лічыцца, што першы сок самы смачны». Чарга рухаецца хутка, бо, па-першае, некаторыя стаяць парамі, па-другое, працэс арганізаваны добра. Пакупнікі падыходзяць са сваёй тарай, прадавец адкручвае кран, устаўляе шланг у бітон ці бутлю. Пакуль запаўняецца вялікая пасудзіна, ён паспявае разлічыць пакупніка і выдаць чэк. Апошні з'яўляецца дакументам для вартаўніка, які падніме шлагбаум на выездзе. Усе заязджаюць на пляцоўку машынамі, бо купляюць па 50, 60, 80 літраў. Некаторыя, праўда, прыходзяць з пяцілітровымі пластыкавымі бутлямі, бяруць усяго некалькі літраў, каб папіць. Але асноўная маса пакупнікоў набывае сок для кансервавання, для квасу, бо летам, у спёку, бярозавік — найлепшы напой. Сок тут прадаецца па 36 капеек за літр. Такім чынам, 60 літраў абыходзіцца нам у 21,6 рубля. Прыходзім да высновы, што гэта выгадна, бо ехаць у лясніцтва, каб купіць там па 19,5 капейкі, эканоміяй не выглядае. На бензін больш патраціш.

НА ЛЯСНОЙ ДЗЯЛЯНЦЫ

Але ў лясніцтве ўсё ж давялося пабываць літаральна праз дзень. Наш добры знаёмы, былы сусед, папрасіў аб гэтым. Ён прадаў машыну па прычыне ўзросту і пагоршання здароўя. А сок прывык нарыхтоўваць сам, ад бярозы. Рабіў гэта многія дзесяцігоддзі. Ну і паехалі ў нядзелю дзеля прагулкі. Праўда, дзень выдаўся не надта лагодны, было халаднавата.

Найбліжэйшае ад Брэста лясніцтва — Мухавецкае, яно і забяспечвае сокам многіх гараджан. Асабліва зручна дабірацца такім, як мы, хто жыве ў паўднёва-ўсходняй частцы абласнога цэнтра, не трэба перасякаць увесь горад, выехаў у прыгарадную Камяніцу Жыравецкую і трымай напрамак далей, у бок лесу.

На сайце пазначана некалькі тэлефонаў нарыхтоўшчыкаў з імёнамі. Я ўзялася абзвоньваць іх у суботу, каб дамовіцца. Дзяўчаты прапаноўвалі паслугі пачынаючы з пятніцы, гэта значыць, амаль праз тыдзень. Трэцім па ліку быў Павел, у яго запіс пачынаўся наогул з наступнай суботы. Але калі пачуў пра патрэбныя пенсіянерам 50 літраў, згадзіўся дабавіць у спіс без чаргі. У яго, як высветлілася, у асноўным па 100 і 200 літраў замаўляюць. Такім чынам нам пашанцавала.

Павел падрабязна патлумачыў маршрут, сказаў, што трэба праехаць вёску Забалацце і стаць на ўзбочыне. Раней мы тут не бывалі, таму прыехалі амаль за паўгадзіны, адна машына ўжо стаяла. А потым падцягнуліся яшчэ дзевяць. Строга ў прызначаны час, дакладней у дзевяць раніцы, пад'ехаў нарыхтоўшчык Павел, з тэлефона зверыў усіх па прозвішчах і заняўках на колькасць літраў і падаў знак рухацца за ім. Такім вось працяглым картэжам мы і заехалі ў лес, дзе Павел, нібы вопытны рэгуліроўшчык, хутка размеркаваў кліентаў па дзялянках вызначанага квартала лясніцтва.

У лесе пакупнікі адно аднаму не перашкаджалі, самі хадзілі паміж бярозамі, адвязвалі мяшкі з сокам і напаўнялі свае бітоны. Ноччу крыху падмарозіла, таму ў асобных мяшках зверху плавала тонкая ледзяная скарынка. Але паміж дрэў холад не адчуваўся. Мы з жонкай суседа Святланай Канстанцінаўнай крыху пагулялі па лесе, убачылі нават першыя пралескі і вельмі абрадаваліся. А сусед Міхаіл Арцёмавіч з маім сынам хутка набралі замоўленыя 50 літраў, загрузілі ў машыну і накіраваліся на «блок-пост» нарыхтоўшчыка. Там ён падлічыў суму, выпісаў квітоў і ўзяў грошы.

Сок у лясніцтве прадаецца па 19,5 капейкі за літр. Дарэчы, за апошнія чатыры гады цана выраслa толькі на 2,5 капейкі, таму ахвотных набыць вітамінны напой нямала. Варта сказаць, што людзі прыязджаюць з любой тарай. Неабавязкова набываць вялікія пасудзіны, з якой прыехаў наш сусед. Адзін мужчына наліваў з дапамогай варонкі 5-літровыя бутлі. Іх стаяла дзясяткі два. Затое зручна і лёгка грузіць, можна справіцца нават аднаму.

Сезон нарыхтоўкі соку на Брэстчыне толькі набірае разгон. За якасць напою леснікі адказваюць. Штогод сок на аналіз бярэ цэнтр стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі, вывяраюць каля 30 паказчыкаў. Шкодных прымесяў альбо радыяцыі ў нашым бярозавіку няма, а вось вялікая колькасць вітамінаў і мікраэлементаў прысутнічае. Таму вельмі карысна ўжываць сок свежым.

Усяго ў гэтым годзе лясгасы Брэсцкага лесагаспадарчага аб'яднання плануюць прадаць насельніцтву каля 650 тон бярозавіку. Так што соку хопіць усім.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Чалавек у асяроддзі

Каму прыпынак перашкаджае?

Разважанне пра маёмасць і свядомасць

У адзіны дзень галасавання была на ўчастку ў новым мікрараёне Брэста, яго яшчэ называюць Зарэчным раёнам. Можна сказаць, адкрыла для сябе гэтую частку горада. Парадавала цікавае архітэктурнае рашэнне, якое падразумявае вялікія дзверы, шмат святла, што разам стварае адчуванне прасторы. Асабліва гэта прыкметна ў раёне вуліц Грунвальдскай і Барыса Маслава.

Фота тэлеграм-канала.

Гарадское асяроддзе сфарміравана не толькі кварталамі жылой забудовы з гандлёвымі пунктамі, тут размяшчаецца новы шматфункцыянальны медыцынскі цэнтр, узвышаецца купаламі новы храм, радуюць вока маладыя дрэўцы парку 1000-годдзя Брэста. А ў адзін з апошніх дзён лютага чытаю ў тэлеграм-канале гарвыканкама паведамленне пра шэсць прыпынкаў па вуліцы Барыса Маслава, якія пашкоджаны невядомымі.

Варта сказаць, што вуліца, названая імем героя вайны, ваеннага ўрача Барыса Маслава, уведзена ў эксплуатацыю ўсяго два гады таму. Для арганізацыі належнага транспартнага забеспячэння былі ўстаноўлены сучасныя і зручныя прыпыначныя павільёны. Цяпер яны стаяць спрэс з пабітым шклом, а месцамі і размаляваныя. Апошняе стала не толькі праблемай гарадскога бюджэту, бо рамонт абыдзецца ў круглую суму, але не магло не засмуціць большасць жыхароў раёна. Многія памятаюць, як урачыста адкрывалі новую паліклініку, самую буйную ў горадзе, як здавалі ў эксплуатацыю жыццёва важны аб'ект — пажарна-аварыйную часць. У памяці, як талакой садзілі новы парк, названы ў гонар тысячагадовага юбілею горада, як гарадскія службы праводзілі добраўпарадкаванне. Здавалася б, усё тут павінна быць прыгожым, доўга служыць людзям. Раён літаральна на вачах вырас на ўскраіне горада, побач — лясны масіў, з ранняй вясны можна пачуць птушыны хор — такая вось перавага над шумным, загазаваным цэнтрам горада. Як той казаў, жыві і радуйся. Але крывыя аўтографы вандалаў вяртаюць да сумнай рэчаіснасці: сярод нас шмат тых, каму разбураць прывычней, чым узводзіць, ствараць. Яны ад гэтага, як выглядае, атрымліваюць задавальненне.

Спецыялісты гарвыканкама напомнілі, што ўладкаванне аднаго прыпыначнага пункта абыходзіцца ў 16 тысяч рублёў, замена аднаго шкла пацягне на тысячу рублёў. А на адным з шасці пашкоджаных прыпынкаў разбіта пяць шкляных панэляў. Факт выклікаў хвалю абурэння ў сацсетках. Адны гараджане вінавацяць бацькоў, што недастаткова ўвагі ўдзяляюць выхаванню нашчадкаў. Паводле іх пераканання, гэта справа рук школьнікаў, якія сваю дурную энергію не выплюхваюць у спартыўных залах, а пасля ўрокаў ідуць біць шкло на прыпынках. Таксама ёсць версія, што шкло пацярпела падчас некалькіх марозных дзён. Адзін пасажыр грамадскага транспарту напісаў, што быў сведкам таго, як ранкам на яго вачах трэскаліся шкляныя панэлі. Яму запярэчылі, маўляў, трэснуць магло раней падбітае шкло.

Некаторыя прыпынкі былі пашкоджаны зусім не ў марозныя дні. Такога ж меркавання прытрымліваецца і галоўны інжынер Брэсцкага дарожна-эксплуатацыйнага прадпрыемства Эдвард Сырэвіч. Эдвард Часлававіч сказаў, што павільёны пацярпелі не толькі тут, ёсць выпадкі псавання прыпыначных пабудоў каля абласной бальніцы, па вуліцы Маскоўскай, на бульвары Касманаўтаў.

...Новае шкло ўжо заказана, днямі спецыялісты заменяць тыя шкляныя панэлі, што былі пашкоджаны. Але ж непрыемны асадак застаецца: ці надоўга, ці не зноў-дзецца зноў нейкі зламыснік, што замахнецца на гарадскую маёмасць, сапсуе прыгажосць, а заадно і настрой пасажыраў грамадскага транспарту.

На жаль, вынікі непрыстойных паводзін суайчыннікаў у грамадскіх месцах даводзіцца канстатаваць не толькі ў абласным цэнтры. Калі ўважліва прасачыць за стужкамі навін раённых тэлеграм-каналаў, прыклады можна знайсці ці не ў кожным раёне. Калегі з Камянецкай раённай газеты паставілі надзвычай кідкі загаловак «Панфілаўцам і не снілася». Гаворка ідзе пра вуліцу Панфілаўцаў, на якой ёсць канава, відаць, для сцёку лішняй вады. І хоць па берагах пастаўлены кантэйнеры, нядбайныя гараджане ператварылі канаву ў звалку: цягнуць сюды бытавыя адходы — ад лістоў бляхі да зрэзаных галін садовых дрэў.

Чытачы івацэвіцкай раённай газеты напісалі аб праблеме лавак у горадзе. Некаторыя з іх не вытрымалі выпрабаванне зімовымі халадамі, дошкі прагнілі, а іншыя пацярпелі ад рук хуліганаў. «Насталі цёплыя дзянькі, — піша пенсіянерка, — захацелася пасядзець на сонейку, а лаўка па вуліцы Дэпутацкай зламана. Побач валяецца бутэлька з-пад піва ды нейкія лахманы».

У доўгія сакавіцкія выхадныя выязджалі з сям'ёй на прагулку ў лясны масіў урочышча Чырвоны Двор, гэта ў гарадской рысе Брэста. Мясціна прыгожая, побач рака Мухавец, маленькія вадаёмы, на ўзгорках ужо цвіце падбел. У першы дзень звярнулі ўвагу на чысціню, відавочна, што нядаўна тэрыторыю прыбіралі. Такіх жа адпачывальнікаў сустракалася нямала. Яно і зразумела: выхадны, сонейка, людзі пацягнуліся з гарадскіх кватэр да прыроды. А на трэці дзень ужо сям-там сярод ігліцы ды апалага лісця сустракаліся сурвэткі, абгорткі, шматкі паперы як сведчанні знаходжання чалавека на прыродзе. Што тут скажаш? Разважаць пра мараль, пра выхаванне, калі ўсе словы разбіваюцца, нібы тое шкло ад каменя на прыпынку? Тыя індывідуумы, што прывыклі жыць у беспарадку, брудзе і ствараць яго вакол сябе, усё роўна не прачытаюць. І кожнага не пракантралюеш. Застаецца спадзявацца, што некалі выхаванне, пра якое шмат гаворым, добры прыклад добрых людзей дадуць жаданыя вынікі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Кіраўніцтва і калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказваюць шчырыя спачуванні родным, блізкім і калегам намесніка дырэктара рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускі дзяржаўны геалагічны цэнтр» Аляксея Іванавіча ВАЎРЫША ў сувязі з яго заўчаснай смерцю.

Мы раздзяляем з вамі горкі боль незаменнай страты выдатнага чалавека, сапраўднага прафесіянала і калегі. Светлая памяць!

РАШЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АБ СТАНЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П. П., намесніка Старшыні Карповіч Н. А., суддзяў Бодак А. М., Бойка Т. С., Варановіча Т. В., Данілюка С. Я., Козыравай Л. Р., Рабцава В. М., Рабцава Л. М., Цікавенкі А. Г., Чыгрынава С. П., разгледзеўшы ў судовым пасяджэнні пытанне аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь,

кіруючыся артыкуламі 22 і 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, артыкуламі 174—176 Закона Рэспублікі Беларусь «О конституционном судопроизводстве»,

ВЫРАШЫЎ:

1. Прыняць Пасланне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь» (дадаецца).

2. Апублікаваць Пасланне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь» у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Старшынствуючы —
Старшыня Канстытуцыйнага
Суда Рэспублікі Беларусь
П. П. МІКЛАШЭВІЧ.

5 сакавіка 2024 г., г. Мінск
№ ПР-2/2024.

ПАСЛАННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АБ СТАНЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь

Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

30-гадовы перыяд дзеяння Канстытуцыі, якая ўстанавіла канстытуцыйныя асновы беларускай дзяржавы і грамадства, вызначыла вектар палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага развіцця, пацвярджае прыхільнасць народа Беларусі да сваіх традыцыйных каштоўнасцяў, культурных і духоўных традыцый, імкненне захаваць нацыянальную самабытнасць і суверэнітэт.

На канстытуцыйных прынцыпах роўнасці і справядлівасці, адзінства і патрыятызму развіваюцца дэмакратычныя формы народаўладдзя, мэтанакіравана і паслядоўна фарміруецца дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава.

Праведзены 27 лютага 2022 г. рэспубліканскі рэферэндум аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю пераканаўча паказаў, што беларускі народ з'яўляецца сапраўдным гаспадаром свайго лёсу і актыўным суб'ектам гістарычнага працэсу, які свабодна і адкрыта выказвае сваю волю пабудаваць сацыяльна справядлівае паспяховае грамадства.

Прыняцце на ўсенародным рэферэндуме абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь — сведчанне праяўлення волі народа захаваць базавыя параметры абранай сацыяльна-эканамічнай мадэлі развіцця, умацаваць дзяржаўны суверэнітэт, абараніць нацыянальную ідэнтычнасць.

Мінулы перыяд дзейнасці Канстытуцыйнага Суда пацвердзіў значэнне канстытуцыйнага кантролю для абароны канстытуцыйнага ладу, асноўных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, забеспячэння вяршэнства Канстытуцыі і яе прамога дзеяння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Унесеныя ў Канстытуцыю змяненні і дапаўненні ўзмацнілі ролю Канстытуцыйнага Суда як канстытуцыйнага арбітра ў сістэме органаў дзяржаўнай улады, пашырылі магчымасці канстытуцыйнага кантролю па абароне правоў і свабод грамадзян.

I

Абноўленая Канстытуцыя з'яўляецца залогам паступальнага канстытуцыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на доўгатэрміновую перспектыву. У ёй вызначана мадэль сучаснай беларускай дзяржавы: дзяржава заснаваецца на волі народа, выражае волю народа, функцыянуе ў інтарэсах народа. Дадзены канстытуцыйны арыенцір абавязвае дзяржаўныя органы, службовых асоб, грамадска-палітычныя інстытуты ў сваёй стваральнай дзейнасці зыходзіць з волі народа і дзейнічаць на карысць народа і, служачы прагрэсу грамадства і дзяржавы, усямерна садзейнічаць дасягненню важнейшых канстытуцыйных мэт: забеспячэнню міру і грамадзянскай згоды, дабрабыту грамадзян, непахіснасці народаўладдзя, незалежнасці і росквіту Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыя — Асноўны Закон дзяржавы — з'яўляецца жыватворнай асновай нацыянальнага права: яе прынцыпы і нормы нясуць у сабе арганізуючы пачатак, забяспечваюць адзінства і ўзаемасувязь, збалансаванасць і гарманічнае развіццё ўсіх састаўляючых прававой сістэмы. Валодаючы велізарным рэгулятыўным патэнцыялам, Канстытуцыя знаходзіць свой працяг у законах, вызначае іх сэнс, змест і вектары ўдасканалення прававога рэгулявання важнейшых грамадскіх адносін.

Канстытуцыяналізацыя заканадаўства, паслядоўнае развіццё каштоўнасцяў, прынцыпаў і нормаў Канстытуцыі ў палажэннях законаў і падзаконных нарматыўных прававых актаў выступаюць канстытуцыйна-прававой асновай пабудовы суверэннай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы.

У заключэннях і рашэннях Канстытуцыйнага Суда раскрываецца шматгранны змест канстытуцыйных прынцыпаў і нормаў, адзначаецца неабходнасць іх выканання ў прававым забеспячэнні дынамічнага развіцця грамадства і дзяржавы.

Канстытуцыйным Судом звернута ўвага, што дынамізм сацыяльных і эканамічных працэсаў прадвызначае патрэбнасць своечасовага, а часам і апераджальнага прававога рэгулявання грамадскіх адносін; пры гэтым указана на прынцыповую важнасць забеспячэння найбольш поўнай рэалізацыі канстытуцыйных палажэнняў у прававым рэгуляванні новых сфер грамадскіх адносін, абумоўленых дасягненнямі навукі і развіццём тэхналогій як базы ўстойлівага інавацыйнага развіцця (рашэнні ад 20 студзеня 2015 г., ад 26 снежня 2020 г.).

Адзначана, што сучасныя працэсы лічбавізацыі грамадскіх адносін напраму ўздзейнічаюць на аб'ём і змест канстытуцыйнага статусу асобы, з'яўляюцца новыя інфармацыйна-лічбавыя магчымасці, фарміруюцца лічбавыя правы і абавязкі; неабходна своечасовае заканадаўчае рэгуляванне новых грамадскіх адносін, якія ўзнікаюць у сувязі з лічбавізацыяй, і новых механізмаў рэалізацыі правоў і свабод, якія маюць віртуальнае выражэнне (рашэнне ад 11 сакавіка 2021 г.).

У сучасных умовах на аснове прынцыпаў і нормаў Канстытуцыі ажыццяўляецца заканадаўчая дзейнасць Парламента, а таксама нарматворчая дзейнасць іншых дзяржаўных органаў па прававым забеспячэнні выкарыстання інавацыйных тэхналогій, эфектыўнай абароны персанальных даных, лічбавізацыі дзяржаўнага кіравання і лічбавай трансфармацыі эканомікі, уключаючы функцыянаванне лічбавых баз даных сацыяльнага прызначэння, развіццё робататэхнікі, стварэнне складаных інтэграваных сістэм з элементамі штучнага інтэлекту ў сферах транспарту, прамысловасці, сацыяльнага абслугоўвання, аховы здароўя і іншых.

Рэалізацыя канстытуцыйнага палажэння аб садзейнічанні дзяржавы развіццю навуковых і тэхнічных даследаванняў, укараненню інавацый на карысць агульных інтарэсаў патрабуе фарміравання ў нацыянальнай прававой сістэме лічбавага права, якое ахоплівае пытанні забеспячэння комплекснага і сістэмнага прававога рэгулявання адносін, звязаных з выкарыстаннем лічбавых тэхналогій, прымяненнем штучнага інтэлекту, забеспячэннем кібербяспекі, пры захаванні гарантый канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян, дэмакратычных асноў дзяржаўнага кіравання, ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці ў інтарэсах чалавека і грамадства.

Нацыянальная канстытуцыйная ідэнтычнасць уласоблена ў фундаментальных палажэннях Канстытуцыі аб асновах канстытуцыйнага ладу, канстытуцыйных правах і свабодах чалавека і грамадзяніна, дэмакратычных прынцыпах функцыянавання органаў дзяржаўнай улады. Канстытуцыйныя каштоўнасці, прынцыпы і нормы, якія ўтвараюць канстытуцыйную ідэнтычнасць беларускай дзяржавы, падкрэсліваюць унікальнасць Рэспублікі Беларусь як паўнапраўнага члена міжнароднага супольніцтва.

Канстытуцыйны Суд неаднаразова звяртаўся да пытанняў зместу канстытуцыйнай ідэнтычнасці і яе належнага забеспячэння. Так, адзначана, што ўдзел Рэспублікі Беларусь у міждзяржаўных утварэннях абумоўлівае неабходнасць захавання прававога суверэнітэту і канстытуцыйнай ідэнтычнасці ва ўмовах узаемадзеяння міжнароднага, наднацыянальнага і нацыянальнага права. Пры фарміраванні наднацыянальнага права неабходна зыходзіць з вяршэнства Канстытуцыі, фундаментальных канстытуцыйных асноў беларускай дзяржавы, якія прадвызначаюць канстытуцыйную ідэнтычнасць. Пры гэтым акты міжнароднага і наднацыянальнага права не могуць абмяжоўваць суверэннае права беларускага народа самастойна вызначаць свой шлях развіцця, прымяншаць канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзян, змяняць дэмакратычны, сацыяльны і прававы характар беларускай дзяржавы (рашэнні ад 21 студзеня 2014 г., ад 20 студзеня 2016 г., ад 23 студзеня 2018 г., ад 14 сакавіка 2019 г.).

Дактрынальна-нарматыўныя палажэнні аб вяршэнстве Канстытуцыі, сутнасці і змесце канстытуцыйнай ідэнтычнасці, сфармуляваныя ў рашэннях Канстытуцыйнага Суда пры праверцы канстытуцыйнасці законаў у парадку папярэдняга кантролю, знайшлі адлюстраванне ў Канцэпцыі прававой палітыкі Рэспублікі Беларусь, зацверджанай Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2023 г. № 196.

Канстытуцыя, з'яўляючыся палітыка-прававым актам з адметнымі ўласцівасцямі, дазваляе перакладаць на мову дзеючага заканадаўства, прававой ідэалогіі і рэальнай палітыкі ідэалы асобы, грамадства і дзяржавы і служыць прававым фундаментам дэмакратычнага ўладкавання грамадства і дзяржавы; эвалюцыйнае канстытуцыйнае развіццё на аснове фундаментальных канстытуцыйных ідэалаў і каштоўнасцяў забяспечвае пераадоленне новых пагроз вяршэнству права і канстытуцыйнаму правапарадку (рашэнне ад 11 сакавіка 2021 г.).

Воля народа, выказаная на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 г. у прыняцці гістарычна наспелых змяненняў Канстытуцыі, узмацняе яе ідэалагічную функцыю ў забеспячэнні кансалідацыі і адзінства грамадства, абароны фундаментальных канстытуцыйных каштоўнасцяў.

Ідэалогія беларускай дзяржавы, што замацавана ў палажэннях Канстытуцыі і ў сваёй аснове з'яўляецца агульнанароднай ідэалогіяй, атрымала вышэйшую легітымацыю ў артыкуле 4 Канстытуцыі як ідэалогія дзяржавы, на аснове якой ажыццяўляецца дэмакратыя ў Рэспубліцы Беларусь і, такім чынам, ствараецца будучыня нашай краіны і дабрабыт кожнага яе грамадзяніна.

У прэамбуле і іншых палажэннях Канстытуцыі абвешчаны базавыя пачаткі і імператывы ідэалогіі беларускай дзяржавы. У іх ліку прыхільнасць да агульначалавечых каштоўнасцяў, захаванне нацыянальнай самабытнасці і суверэнітэту, апора на шматвяковую гісторыю развіцця беларускай дзяржаўнасці, культурныя і духоўныя традыцыі, сцвярджэнне правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, асноў прававой дзяржавы і сацыяльна справядлівага грамадства, забеспячэнне міру і грамадзянскай згоды, дабрабыту грамадзян, непахіснасці народаўладдзя, незалежнасці і росквіту Рэспублікі Беларусь.

Палажэнні Канстытуцыі, якія ўстанаўліваюць абавязак дзяржавы і абавязак кожнага грамадзяніна захоўваць гістарычную праўду і памяць аб гераічным мінулым беларускага народа і яго неўміручым подзвігу ў гады Вялікай Айчыннай вайны, садзейнічаюць умацаванню пачуцця патрыятызму, грамадзянскасці, вернасці сваёй Айчыне і гатоўнасці абараніць інтарэсы Радзімы.

Ідэалогія беларускай дзяржавы ляжыць у аснове пабудовы беларускай мадэлі дзяржаўнага развіцця — дзяржавы для народа, вызначае стратэгію гэтага развіцця на доўгачасовы перыяд.

Духоўна-маральны змест і ідэалагічны патэнцыял Канстытуцыі фарміруюць у грамадскай свядомасці разуменне таго, што павага, усвядомленае і добраахвотнае выкананне Канстытуцыі і законаў сваёй краіны з'яўляецца асновай кансалідацыі і адзінства грамадства.

Дактрынальнае асэнсаванне палажэнняў абноўленай Канстытуцыі ў іх сістэмнай узаемасувязі дазваляе зрабіць вывад, што бяспека асобы, грамадства і дзяржавы акумулюецца ў дыялектычна шматпланавым паняцці канстытуцыйнай бяспекі. Канстытуцыйная бяспека характарызуе абароненасць жыццёва важных інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы ад унутраных і знешніх пагроз, непахіснасць канстытуцыйнага ладу і немагчымасць яго змены нелегітымным шляхам.

Канстытуцыйны Суд неаднаразова звяртаў увагу заканадаўца, што ва ўмовах сучасных выклікаў і глабальных пагроз асабліва значэнне набывае рэальнае забеспячэнне канстытуцыйна-прававога статусу асобы, правоў і свабод грамадзян, а таксама юрыдычных гарантый іх рэалізацыі. Зыходзячы з прынцыпу вяршэнства права заканадаўцу належыць забяспечваць прававое рэгуляванне грамадскіх адносін, якое адпавядае прынцыпу канстытуцыйнай бяспекі асобы, устанаўліваючы аб'ектыўна неабходныя і сацыяльна абгрунтаваныя прававыя абмежаванні і ўскладаючы дадатковыя абавязкі на грамадзян, прытрымліваючыся аптымальнага балансу прыватных і публічных інтарэсаў, захоўваючы сутнасць і цэласнасць каштоўнасна-сутнаснага зместу канстытуцыйных правоў і свабод чалавека.

II

1. Забеспячэнне вяршэнства Канстытуцыі і яе прамога дзеяння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь Канстытуцыйны Суд ажыццяўляе праз кантроль за канстытуцыйнасцю ўсіх нарматыўных прававых актаў у дзяржаве. У рашэннях і фармулюемых у іх прававых пазіцыях Канстытуцыйны Суд шляхам выяўлення канстытуцыйна-прававога сэнсу нормаў законаў і іншых нарматыўных прававых актаў сцвярджае вяршэнства Канстытуцыі ў нарматворчасці і правапрымяненні, спрыяе выпрацоўцы прававых механізмаў развіцця і абароны канстытуцыйных каштоўнасцяў і дасягнення канстытуцыйна значных мэт, арыентуе заканадаўца і правапрымяняльнікаў на няўхільнае выкананне канстытуцыйных палажэнняў і іх рэальнае забеспячэнне.

Праз канстытуцыйнае правасуддзе змяняецца якасць прававой сістэмы: фарміруецца асаблівы палітыка-прававы рэжым вяршэнства Канстытуцыі, яе прававой абароны як акта прамога дзеяння, які гарантуе збалансаваную рэалізацыю фундаментальных каштоўнасцяў грамадства і дэмакратычнай прававой дзяржавы.

Канстытуцыйны Суд пастаянна звяртае ўвагу, што пры ажыццяўленні прававога рэгулявання грамадскіх адносін ад нарматворчых органаў патрабуюцца паслядоўная і сістэмная рэалізацыя і развіццё канстытуцыйных

АБ СТАНЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ

прынцыпаў і каштоўнасцяў у мэтах легітымнасці і сацыяльнай прымальнасці нарматыўных прававых актаў. Пры гэтым у заканатворчай дзейнасці галоўнай умовай абароны асноў канстытуцыйнага ладу, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, сцвярджэння канстытуцыйнай законнасці выступае рэалізацыя ў поўнай меры прынцыпу вяршэнства Канстытуцыі.

У рашэнні па праверцы канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «О нормативных правовых актах» (прынята 12 ліпеня 2018 г.) Канстытуцыйным Судом выказана прававая пазіцыя, згодна з якой вызначэнне і раскрыццё заканадаўцам зместу прынцыпаў нарматворчай дзейнасці мае на мэце забеспячэнне вяршэнства Канстытуцыі, каштоўнасцяў і прынцыпаў Канстытуцыі, якія прадвызначаюць сутнасць і змест прававой сістэмы Беларусі, а таксама дасягненне адназначнага разумення заканадаўчых прадпісанняў, якімі павінны кіравацца ўсе суб'екты нарматворчай дзейнасці на ўсіх стадыях нарматворчага працэсу.

Канстытуцыйны Суд адзначае, што забеспячэнне вяршэнства Канстытуцыі ў заканатворчай дзейнасці азначае, што ў выпадках устанаўлення ў законах абмежаванняў правоў і свабод асобы мэты дыскрэцыйных паўнамоцтваў заканадаўца вызначаюцца канстытуцыйнымі прынцыпамі і нормамі з захаваннем балансу і суразмернасці ахоўваемых Канстытуцыяй каштоўнасцяў і інтарэсаў.

У рашэннях Канстытуцыйнага Суда сфармуляваныя палажэнні, якія развіваюць прававую дактрыну вяршэнства і прамога дзеяння Канстытуцыі, вызначаны асноўныя кірункі сучаснага беларускага канстытуцыяналізму, арыенціры далейшага стабільнага канстытуцыйнага развіцця прававой сістэмы. Звернута ўвага, што вяршэнства Канстытуцыі ў дзяржаўным і грамадскім жыцці прадугледжвае няўхільнае выкананне дзяржавай, усімі яе органамі і службовымі асобамі, а таксама грамадзянамі і арганізацыямі прадпісанняў Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёй актаў заканадаўства, што, у сваю чаргу, стварае неабходныя перадумовы забеспячэння ў дзяржаве належнага ўзроўню канстытуцыйнай законнасці (рашэнне ад 20 студзеня 2016 г.); праз сцвярджэнне вяршэнства Канстытуцыі, канстытуцыйных каштоўнасцяў у нарматворчасці і правапрымяненні ажыццяўляецца канстытуцыяналізацыя грамадскіх адносін, устанаўліваецца рэжым канстытуцыйнай законнасці, пры якім дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы, а таксама арганізацыі і грамадзяне дзейнічаюць на аснове і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, а права як важнейшы сацыяльны рэгулятар забяспечвае дасягненне мэт і вырашэнне задач, вызначаных Асноўным Законам дзяржавы (рашэнне ад 14 сакавіка 2023 г.).

На сучасным этапе развіцця беларускай дзяржаўнасці ў мэтах забеспячэння рэалізацыі прынцыпу вяршэнства Канстытуцыі, абароны канстытуцыйнага ладу, гарантаваных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, далейшага ўмацавання канстытуцыйнай законнасці ў заканатворчасці і правапрымяненні ў абноўленай Канстытуцыі ўдасканалены канстытуцыйна-прававы механізм ажыццяўлення канстытуцыйнага кантролю, які прадугледжвае значнае пашырэнне кампетэнцыі Канстытуцыйнага Суда.

2. Абарона канстытуцыйнага ладу з'яўляецца неабходнай умовай жыццядзейнасці і ўстойлівага грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця, а таксама важнейшай функцыяй дзяржавы, ажыццяўленне якой выступае гарантыяй яе суверэнітэту, незалежнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці, службе асноваў забеспячэння вяршэнства права, рэалізацыі правоў і свабод кожнага, сцвярджэння Рэспублікі Беларусь як дэмакратычнай прававой дзяржавы.

Захаванне рэжыму канстытуцыйнай заканнасці з'яўляецца канстытуцыйным абавязкам усіх суб'ектаў грамадска-палітычных адносін і грамадзян нашай краіны ў мэтах забеспячэння процідзеяння любому дэструктыўнаму ўздзеянню на стабільнасць і суверэнітэт дзяржавы, грамадзянскі мір і згоду ў грамадстве, устойлівасць канстытуцыйнага ладу.

25 жніўня 2020 г. Канстытуцыйны Суд выказаў канстытуцыйна-прававую пазіцыю па абароне канстытуцыйнага ладу, у якой указаў, што пры рэалізацыі палітычных правоў грамадзяне павінны ўлічваць, што ў адпаведнасці з часткай другой артыкула 3 Канстытуцыі любыя дзеянні па змяненні канстытуцыйнага ладу і дасягненні дзяржаўнай улады гвалтоўнымі метадамі, а таксама шляхам іншага парушэння законаў Рэспублікі Беларусь караюцца згодна з законам.

Зместам устаноўленых Канстытуцыяй асноў канстытуцыйнага ладу — сістэмы канстытуцыйных прынцыпаў, якія замацоўваюць асновы дзяржаўнага і грамадскага ладу, абумоўлена патрэбнасць прыняцця адэкватных мер, накіраваных на абарону Асноўнага Закона, уключаючы абавязак дзяржавы па ўстанаўленні неабходных для гэтага прававых механізмаў.

У мэтах абароны канстытуцыйнага ладу заканадавец, зыходзячы з прынцыпаў канстытуцыйнага прававарадарку, не толькі мае права, але і абавязаны выкарыстоўваць усе даступныя ў рамках сваіх дыскрэцыйных паўнамоцтваў сродкі па ўстанаўленні юрыдычнай адказнасці фізічных і юрыдычных асоб за правапарушэнні, накіраваныя на падрыў канстытуцыйнага ладу.

У рашэннях па праверцы канстытуцыйнасці законаў Рэспублікі Беларусь «О недопущении реабилитации нацизма», «Об изменении законов по вопросам противодействия экстремизму», «Об изменении законов по вопросам защиты суверенитета и конституционного строя» Канстытуцыйны Суд сфармуляваў прававыя пазіцыі, указаўшы, што ў сучасных складаных геапалітычных умовах найбольш небяспечнай рэальнай пагрозай канстытуцыйнаму ладу Рэспублікі Беларусь, яе суверэнітэту, нацыянальнай бяспецы, грамадскаму парадку, правам і свабодам грамадзян з'яўляюцца экстрэмізм як прыхільнасць да крайніх поглядаў і метадаў дзеянняў для дасягнення сваіх мэт, нацызм як адна з найбольш небяспечных форм яго праяўлення, а таксама акты тэрарызму, дзейнасць тэрарыстычных арганізацый, незаконных узброеных фарміраванняў, масавыя беспарадкі. Вызначанае нормамі вышэйназваных законаў прававое рэгуляванне па недапушчэнні названых найбольш дэструктыўных і разбуральных сацыяльных з'яў, якое ўстанаўлівае ў тым ліку крымінальную адказнасць за ўчыненне адпаведных супрацьпраўных дзеянняў, мае на мэце забеспячэнне рэалізацыі канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права, палажэнняў Канстытуцыі аб абароне канстытуцыйнага ладу (рашэнні ад 30 красавіка 2021 г., ад 6 ліпеня 2021 г.).

Важнейшым фактарам дзейснай абароны канстытуцыйнага ладу, правоў і свабод грамадзян з'яўляецца канстытуцыйны прававарадак, забеспячэнне якога ў сучасных умовах магчыма пры няўхільным выкананні ўсімі суб'ектамі грамадскіх адносін рэжыму канстытуцыйнай законнасці.

Правяраючы канстытуцыйнасць змяненняў, унесеных у Закон Рэспублікі Беларусь «О массовых мероприятиях», Канстытуцыйны Суд адзначыў, што згодна з артыкулам 35 Канстытуцыі свабода сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і пікетавання гарантуецца дзяржавай пры ўмове, калі пры гэтым не парушаюцца правапарадак і правы іншых грамадзян Рэспублікі Беларусь. Пры заканадаўчым вызначэнні парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў павінны быць забяспечаны прадугледжаныя ў артыкуле 35 Канстытуцыі і іншыя канстытуцыйныя каштоўнасці. Абавязак дзяржавы па ўстанаўленні прававых механізмаў, якія забяспечваюць грамадскі парадак і грамадскую бяспеку пры правядзенні масавых мерапрыемстваў, прадухіляюць магчымыя парушэнні канстытуцыйных правоў і ахоўваемых законам інтарэсаў грамадзян, непасрэдна вынікае таксама з замацаваных Канстытуцыяй асноў канстытуцыйнага ладу (рашэнне ад 30 красавіка 2021 г.).

Рашэнні Канстытуцыйнага Суда, якія ўказваюць на патрабаванні і ўмовы выканання рэжыму канстытуцыйнай законнасці ў сучасных грамадскіх адносінах, рэалізацыя канстытуцыйных прынцыпаў як у заканадаўчай, так і ў правапрымяняльнай практыцы прадвызначаюць далейшыя кірункі развіцця прававой сістэмы для забеспячэння абароны асноў канстытуцыйнага ладу, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, умацавання канстытуцыйнага прававарадарку.

3. У адпаведнасці з Канстытуцыяй кожны абавязаны паважаць годнасць, правы, свабоды, законныя інтарэсы іншых асоб. З гэтага і іншых канстытуцыйных палажэнняў вынікае, што любы грамадзянін валодае правам на рэалізацыю канстытуцыйных правоў і свабод толькі ў той меры, у якой гэта не парушае правы і свабоды іншых асоб, не замахваецца на канстытуцыйны лад і маральныя асновы грамадства. У выпадках, вызначаных законам, рэалізацыя правоў і свабод асобных катэгорый грамадзян можа быць спалучана са збалансаваным абмежаваннем правоў і свабод іншых суб'ектаў праваадносін.

Пры ажыццяўленні заканадаўчага рэгулявання юрыдычнай адказнасці павінен быць забяспечаны аптымальны баланс правоў і свабод прыцягваемай да яе асобы і публічнага інтарэсу, які заключаецца ў эфектыўнай абароне асобы, грамадства і дзяржавы ад правапарушэнняў. Устанаўліваемыя пры гэтым абмежаванні правоў і свабод павінны не толькі быць юрыдычна дапушчальныя, але і адпавядаць патрабаванням справядлівасці і суразмернасці канстытуцыйна прызнаваемым мэтам гэтых абмежаванняў, гэта значыць уводзіцца зыходзячы з вяршэнства Канстытуцыі і з улікам прынцыпу вяршэнства права, што мае значэнне ўніверсальнай каштоўнасці, на якой грунтуюцца гарантыі правоў і свабод асобы.

Заканадаўцу пры ўстанаўленні законам абмежаванняў таго ці іншага права ў адпаведнасці з канстытуцыйна вызначанымі інтарэсамі належыць выкарыстоўваць не празмерныя, а толькі строга абумоўленыя гэтымі інтарэсамі меры. Публічныя інтарэсы, названыя ў частцы першай артыкула 23 Канстытуцыі, могуць апраўдваць абмежаванне правоў і свабод толькі ў тым выпадку, калі яны адэкватныя сацыяльна необходнаму выніку.

У рашэнні па праверцы канстытуцыйнасці Працэсуальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (прынята 28 снежня 2020 г.) звернута ўвага, што меры забеспячэння адміністрацыйнага працэсу, якія прадугледжваюцца гэтым Кодэксам, у тым ліку адміністрацыйнае затрыманне фізічнай асобы, накладанне арышту на маёмасць, будучы па сваёй сутнасці мерамі працэсуальнага прымусу, у пэўнай ступені абмяжоўваюць правы і свабоды грамадзян, правы і законныя інтарэсы юрыдычных асоб.

Канстытуцыйным Судом выказана прававая пазіцыя аб тым, што палажэнні названага Кодэкса, якія вызначаюць парадак прымянення мер забеспячэння адміністрацыйнага працэсу, адпавядаюць нормам Канстытуцыі, паколькі гэтыя меры абмежавальнага характару не скажаюць сутнасці канстытуцыйных правоў і свабод, не вядуць да страты іх рэальнага зместу, прымяняюцца толькі ў адносінах да пэўных катэгорый асоб і за ўчыненне асобных канкрэтных правапарушэнняў. Такія абмежаванні ўлічваюць прынцыпы прапарцыянальнасці, справядлівасці і гуманізму, з'яўляюцца сродкамі прававой абароны грамадскага парадку, правоў і свабод іншых асоб і суразмерны абараняемым Канстытуцыяй мэтам і каштоўнасцям.

Замацаваныя ў Канстытуцыі права кожнага на судовую абарону і звязанае з ім права на абскарджанне ў суд рашэнняў і дзеянняў (бяздзеяння) дзяржаўных органаў і службовых асоб, якія ўшчамляюць правы і свабоды, выступаюць гарантыяй у дачыненні да ўсіх іншых канстытуцыйных правоў і свабод. Права на судовую абарону з'яўляецца ўніверсальным прававым сродкам дзяржаўнай абароны правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, выконвае важнейшую гарантыйна-аднаўленчую функцыю, у сувязі з чым дзяржава абавязана забяспечыць рэальны доступ да правасуддзя, поўнае ажыццяўленне права на судовую абарону.

Судовая абарона правоў і свабод грамадзян павінна забяспечваць эфектыўнае аднаўленне парушаных правоў, сцвярджэнне вяршэнства права, законнасці і справядлівасці. У сувязі з гэтым у шэрагу рашэнняў Канстытуцыйны Суд указваў, што канстытуцыйнае права на судовую абарону — гэта права не толькі на зварот у суд, але і на своечасовае і поўнае выкананне судовых рашэнняў з мэтай атрымання дзейснай абароны шляхам аднаўлення парушаных правоў і свабод у адпаведнасці з заканадаўствам; без поўнага і своечасовага выканання судовых актаў, што ўступілі ў законную сілу, немагчыма рэалізацыя канстытуцыйнага права кожнага на судовую абарону, якое мае канчатковай мэтай аднаўленне парушаных правоў і законных інтарэсаў праз правасуддзе.

Няўхільнае прытрымліванне ў заканатворчасці прынцыпаў і нормаў Канстытуцыі стварае неабходныя прававыя механізмы для гарантавання і абароны канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян, справядлівага балансу публічна-прававых і прыватнаправавых інтарэсаў, забеспячэння канстытуцыйнай законнасці і канстытуцыйнага правапарадку.

III

1. Палажэнні абноўленай Канстытуцыі, устанаўліваючы паслядоўнае размежаванне кампетэнцыі Канстытуцыйнага Суда і судоў агульнай юрысдыкцыі ў сцвярджэнні канстытуцыйнай законнасці, абумоўліваюць неабходнасць іх узаемадзеяння для забеспячэння вяршэнства Канстытуцыі, абароны канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян.

Канстытуцыйны Суд, зыходзячы з сэнсу артыкула 60 Канстытуцыі, які гарантуе кожнаму судовую абарону яго правоў і свабод, паслядоўна і прынцыпова займаў пазіцыю аб неабходнасці забеспячэння прамога доступу грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя і ўвядзення інстытута індывідуальнай канстытуцыйнай скаргі ў Рэспубліцы Беларусь (рашэнні ад 26 студзеня 2010 г., ад 25 студзеня 2011 г., ад 18 студзеня 2012 г., ад 14 сакавіка 2019 г. і інш.). Выказаныя Канстытуцыйным Судом прававыя пазіцыі ўлічаны і рэалізаваны ў абноўленай Канстытуцыі і прынятым у адпаведнасці з ёй заканадаўстве аб канстытуцыйным судаводстве.

Устанаўленне абноўленай Канстытуцыяй магчымасці звароту грамадзяніна аб праверцы канстытуцыйнасці закона, прыменянага ў канкрэтнай справе, якім, па меркаванні грамадзяніна, парушаны яго канстытуцыйныя правы і свабоды, з'яўляецца важным этапам развіцця канстытуцыйнага правасуддзя ў Беларусі. Названыя канстытуцыйныя змяненні сведчаць аб узмацненні канстытуцыйных гарантый прававога статусу асобы і пашырэнні прававых механізмаў рэалізацыі і абароны правоў і свабод грамадзян. Па сутнасці, грамадзяне становяцца актыўнымі суб'ектамі сацыяльнага кантролю за якасцю нарматворчай дзейнасці, выкарыстоўваючы нададзенае ім права аспрэчваць канстытуцыйнасць законаў, якія закранаюць іх інтарэсы.

З моманту ўступлення ў сілу з 1 кастрычніка 2023 г. Закона «О конституционном судопроизводстве» ў Канстытуцыйны Суд паступіла больш за 50 звароту грамадзян аб праверцы канстытуцыйнасці законаў, прыменых у канкрэтнай справе, якія, па іх меркаванні, парушаюць канстытуцыйныя правы і свабоды.

Скаргі грамадзян, якія паступаюць у Канстытуцыйны Суд, вывучаюцца ва ўстаноўленым законам парадку і вызначаецца спосаб іх далейшага вырашэння. У выпадках неадпаведнасці канстытуцыйных скаргаў палажэнням Закона «О конституционном судопроизводстве» грамадзянам паведамляецца аб неабходнасці выканання патрабаванняў закона для разгляду канстытуцыйных скаргаў Канстытуцыйным Судом з вынясненнем рашэння.

Аналіз паказвае, што многія звароты не адносяцца да кампетэнцыі Канстытуцыйнага Суда, а падлягаюць разгляду ў судах агульнай юрысдыкцыі або ў іншых дзяржаўных органах.

Для эфектыўнай рэалізацыі грамадзянамі права на зварот з канстытуцыйнай скаргай неабходна кваліфікаваная падрыхтоўка такой скаргі, якая павінна адпавядаць усім умовам допушчальнасці, а таксама агульным патрабаванням да яе зместу, уключаючы юрыдычна дакладна сфармуляваную пазіцыю грамадзяніна па пастаўленым у канстытуцыйнай скарзе пытанні аб неканстытуцыйнасці закона, прыменена ў канкрэтнай справе, са спасылкай на адпаведныя нормы Канстытуцыі. Для гэтага патрабуюцца арганізацыя ўсебаковай тлумачальнай работы з прыцягненнем існуючых інфармацыйных рэсурсаў і аказанне грамадзянам кваліфікаванай юрыдычнай дапамогі.

У мэтах аказання садзейнічання рэалізацыі права грамадзян на доступ да канстытуцыйнага правасуддзя і стварэння максімальна спрыяльных для гэтага ўмоў у Канстытуцыйным Судзе актыўна ўкараняюцца інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі. Так, грамадзяне, якія жадаюць звярнуцца ў Канстытуцыйны Суд, могуць падаць канстытуцыйную скаргу ў электронай форме праз стварэнне на афіцыйным сайце Канстытуцыйнага Суда ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт асабістага кабінета і запаўненне ў ім спецыяльнай рэгістрацыйнай формы з дадаткам неабходных дакументаў і іншых матэрыялаў.

Інстытут канстытуцыйнай скаргі з'яўляецца важным фактарам захавання канстытуцыйнай законнасці ў заканадаўчым працэсе і правапрымяняльнай практыцы, стварае ўмовы для непасрэднага доступу грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя, што дазваляе ўстараняць скажэнне канстытуцыйна-прававога сэнсу нор-

Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

маў закона пры прымяненні ў канкрэтнай судовай справе, павышае давер грамадства да заканадаўчага рэгулявання грамадскіх адносін.

2. Забеспячэнне вяршэнства Канстытуцыі і яе прамога дзеяння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь — задача не толькі Канстытуцыйнага Суда, але і ўсіх звёнаў сістэмы судоў агульнай юрысдыкцыі.

Абноўленай Канстытуцыяй устаноўлена права судоў агульнай юрысдыкцыі на зварот у Канстытуцыйны Суд з запытам аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта, які падлягае прымяненню пры разглядзе судамі канкрэтных спраў. Такім чынам, праву судоў агульнай юрысдыкцыі ініцыяваць праверку канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта карэспандуе паўнамоцтва Канстытуцыйнага Суда правяраць ва ўстаноўленым парадку канстытуцыйнасць гэтага нарматыўнага прававога акта.

Па выніках разгляду і вырашэння справы Канстытуцыйны Суд выносіць рашэнне ці аб адпаведнасці Канстытуцыі (канстытуцыйнасці), ці аб неадпаведнасці Канстытуцыі (неканстытуцыйнасці) нарматыўнага прававога акта або яго асобных палажэнняў, што дазваляе ўстараняць з прававой прасторы не адпаведныя Канстытуцыі нарматыўныя прававыя акты, папярэджваць магчымасць дапушчэння судовай памылкі і забяспечваць тым самым канстытуцыяналізацыю правапрымяняльнай практыкі.

Праяўленне судамі агульнай юрысдыкцыі канстытуцыйнай актыўнасці ў рэалізацыі нададзенага ім Канстытуцыяй паўнамоцтва па звароце ў Канстытуцыйны Суд з запытам будзе ў поўнай меры адпавядаць мэтам забеспячэння вяршэнства Канстытуцыі і вяршэнства права, паслужыць фарміраванню канстытуцыйна-прававога механізму ўзаемадзеяння судоў агульнай юрысдыкцыі і Канстытуцыйнага Суда па дасягненні больш высокага ўзроўню судовай абароны правоў і свабод грамадзян.

IV

Дзейснасць канстытуцыйнага правасуддзя, сцвярджэнне канстытуцыйнай законнасці ў нарматворчасці і правапрымяненні асноўваюцца на своечасовым і эфектыўным выкананні рашэнняў Канстытуцыйнага Суда і рэалізацыі выражаных у іх прававых пазіцый.

1. У 2023 годзе выканана рашэнне Канстытуцыйнага Суда «О правовом регулировании письменных разъяснений применения нормативных правовых актов» (прынята 3 кастрычніка 2019 г.), у якім указана, што Закон «О нормативных правовых актах», надаючы ўпаўнаважаным дзяржаўным органам (арганізацыям) права пры неабходнасці падрыхтоўваць пісьмовыя растлумачэнні прымянення нарматыўных прававых актаў, не прадугледжвае палажэнняў аб юрыдычнай сіле і характары такіх пісьмовых растлумачэнняў, што сведчыць аб наяўнасці ў названым Законе прававой нявызначанасці, якая спараджае магчымасць неадназначнага разумення нормаў права і іх неаднастайнага прымянення і тым самым можа выклікаць парушэнне канстытуцыйных гарантый рэалізацыі і абароны правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян і юрыдычных асоб. У мэтах забеспячэння канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права Канстытуцыйны Суд прызнаў неабходным выключыць з палажэнняў Закона названую прававую нявызначанасць.

Рашэнне выканана Законам Рэспублікі Беларусь ад 7 красавіка 2023 г. № 261-З «Об изменении Закона Республики Беларусь «О нормативных правовых актах», якім пункт 2 артыкула 69 Закона «О нормативных правовых актах» дапоўнены палажэннямі аб тым, што растлумачэнні прымянення нарматыўных прававых актаў носяць рэкамендацыйны характар; прававыя наступствы невыканання заканадаўства, дапушчанага з прычыны выканання растлумачэнняў прымянення нарматыўных прававых актаў, нададзеных дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі), названымі ў частцы першай гэтага пункта, могуць устанаўлівацца заканадаўчымі актамі.

2. У шэрагу законаў былі рэалізаваны прававыя пазіцыі, якія змяшчаюцца ў рашэннях Канстытуцыйнага Суда, прынятых у парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў.

2.1. Пры праверцы канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь» Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 28 снежня 2017 г. указаў, што ў адпаведнасці з часткай шостай артыкула 85 Закона «О конституционном судопроизводстве» нарматыўныя прававыя акты, прызнаныя згодна з заключэннямі Канстытуцыйнага Суда не адпаведнымі Канстытуцыі, міжнародна-прававым актам, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь, законам, дэкрэтам і ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, не могуць прымяняцца судамі, іншымі дзяржаўнымі органамі, іншымі арганізацыямі, службовымі асобамі. Калі іншае не ўстаноўлена Канстытуцыйным Судом, заснаваныя на такіх актах рашэнні судоў павінны быць ва ўстаноўленым парадку перагледжаны, а прынятыя (выдадзеныя) іншымі дзяржаўнымі органамі, іншымі арганізацыямі, службовымі асобамі прававыя акты — спыніць сваё дзеянне.

Аднак у палажэннях правяраемага Закона, якімі рэгламентуюцца пытанні вядзення справы па пераглядзе судовых пастаноў па новаадкрытых акалічнасцях (глава 34 Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), гэтая акалічнасць не ўключана ў пералік падстаў для перагляду судовых пастаноў, якія ўступілі ў законную сілу, па новаадкрытых акалічнасцях, што сведчыць аб прабеле канстытуцыйна-прававога рэгулявання грамадскіх адносін у гэтай сферы.

Дадзены прабел устаранёны Законам Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2023 г. № 284-З «Об изменении законов по вопросам конституционного судопроизводства», якім частка другая артыкула 452 Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса, што вызначае пералік падстаў для перагляду судовых пастаноў па новаадкрытых акалічнасцях, дапоўнена такой падставай, як прызнанне Канстытуцыйным Судом нарматыўнага прававога акта, прымененага пры разглядзе справы, або яго асобных палажэнняў не адпаведнымі Канстытуцыі (неканстытуцыйнымі), калі ў адпаведнасці з заканадаўствам аб канстытуцыйным судаводстве такое прызнанне цягне перагляд судовых пастаноў.

2.2. Ацэньваючы норму аб выключэнні з артыкула 3 Закона Рэспублікі Беларусь «О почтовой связи» палажэння, згодна з якім заканадаўства аб паштовай сувязі складаецца ў тым ліку з міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 10 чэрвеня 2019 г. пацвердзіў прававую пазіцыю, сфармуляваную ў рашэнні ад 7 мая 2018 г., сутнасць якой заключаецца ў тым, што, разам з актамі ўнутрыдзяржаўнага заканадаўства — законамі Рэспублікі Беларусь, дэкрэтамі і ўказамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, падзаконнымі нарматыўнымі прававымі актамі, міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь уваходзяць у сістэму дзеючага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прававога рэгулявання, гэта значыць іх нормы з'яўляюцца састаўной часткай дзеючага права, і звярнуў увагу заканадаўца, што ў неабходных выпадках у сферу прававога рэгулявання адпаведных грамадскіх адносін, разам з Канстытуцыяй, законамі, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, неабходна ўключаць таксама міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь, паколькі яны разам з актамі ўнутрыдзяржаўнага заканадаўства ўтвараюць прававую сістэму Рэспублікі Беларусь.

Прававая пазіцыя Канстытуцыйнага Суда ўлічана ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2023 г. № 324-З «Об изменении законов по вопросам лицензирования», у адпаведнасці з якім артыкул 3 Закона «О почтовой связи» выкладзены ў новай рэдакцыі, якая прадугледжвае ў тым ліку, што адносіны ў галіне паштовай сувязі рэгулююцца заканадаўствам аб паштовай сувязі, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія змяшчаюць абавязацельствы Рэспублікі Беларусь.

2.3. У рашэнні па праверцы канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «О Совете Министров Республики Беларусь» (прынята 8 ліпеня 2008 г.) Канстытуцыйны Суд прыйшоў да вываду, што рэдакцыя артыкула 4 дадзенага Закона, якая дапускае магчымасць уключэння ў склад Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь іншых службовых асоб, выкладзена неадназначна, што можа прывесці на практыцы да прыняцця рашэнняў, якія не адпавядаюць патрабаванням часткі чацвёртай артыкула 106 Канстытуцыі.

У адпаведнасці са змяненнямі Канстытуцыі, прынятымі на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 г., частка чацвёртая артыкула 106 Канстытуцыі прадугледжвае магчымасць уключэння ў склад Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь кіраўнікоў не толькі дзяржаўных органаў, але і арганізацый.

Законам Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2022 г. № 236-З унесены змяненні ў Закон «О Совете Министров Республики Беларусь», якімі артыкул 4 гэтага Закона прыведзены ў адпаведнасць з названай нормай абноўленай Канстытуцыі.

3. У Пасланні «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2013 годзе» (рашэнне ад 21 студзеня 2014 г.) Канстытуцыйны Суд адзначыў, што канстытуцыяналізацыя грамадскіх адносін у Рэспубліцы Беларусь патрабуе мэтанакіраванага правядзення навукова абгрунтаванай прававой палітыкі дзяржавы. Дасягнуты ўзровень дзяржаўнага будаўніцтва і сацыяльна-эканамічнага развіцця, інтэграцыйныя працэсы, якія адбываюцца, абумоўліваюць неабходнасць распрацоўкі комплекснага дакумента — адзінай Канцэпцыі дзяржаўнай прававой палітыкі Рэспублікі Беларусь у мэтах належнага прававога забеспячэння дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, правоў і свабод грамадзян у сучасных умовах.

У Пасланні Канстытуцыйнага Суда «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь» (рашэнне ад 10 сакавіка 2022 г.) указана, што для забеспячэння працэсу дасягнення канстытуцыйных мэт сучаснага развіцця грамадства і дзяржавы неабходна прыняцце Канцэпцыі прававой палітыкі, якая вызначае стратэгію далейшага ўдасканальвання прававой сістэмы, нацыянальнага заканадаўства, развіцця прававой навукі і юрыдычнай практыкі, сістэмнага фарміравання правасвядомасці і прававой культуры.

Дадзеныя палажэнні пасланняў Канстытуцыйнага Суда рэалізаваны ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2023 г. № 196, якім зацверджана Канцэпцыя прававой палітыкі Рэспублікі Беларусь.

V

1. Для поўнай і эфектыўнай рэалізацыі палажэнняў абноўленай Канстытуцыі заканадаўцам выпрацаваны адпаведны заканадаўчы механізм: Парламентам — Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь прынята больш за 90 законаў, накіраваных на забеспячэнне функцыянавання на абноўленай канстытуцыйнай аснове сістэмы дзяржаўных органаў, інстытутаў народаўладдзя, магчымасцяў грамадзян па рэалізацыі і абароне сваіх канстытуцыйных правоў і свабод.

Заканатворчы працэс на розных стадыях забяспечваецца якаснай сістэмнай работай дзяржаўных органаў пры належным захаванні балансу канстытуцыйных функцый органаў заканадаўчай і выканаўчай улады.

У мінулым годзе зваротаў ад упаўнаважаных органаў аб праверцы канстытуцыйнасці нормаў прынятых законаў або па іншых канстытуцыйных спрэчках у Канстытуцыйны Суд не паступала.

Канстытуцыйны Суд канстатуе, што рэжым канстытуцыйнай законнасці выконваецца ўсімі суб'ектамі канстытуцыйных адносін, якія дзейнічаюць у адпаведнасці са сваімі канстытуцыйнымі паўнамоцтвамі, правамі і абавязкамі ў мэтах падтрымання належнага канстытуцыйнага правапарадку ў краіне.

2. Пры ажыццяўленні прававой палітыкі неабходна не толькі своечасова рэагаваць на актуальныя праблемы прававога рэгулявання грамадскіх адносін, але і прымаць канкрэтныя прававыя меры па прадухіленні магчымых выклікаў і пагроз з дапамогай апераджальнай заканатворчасці.

Дасягненне высокай якасці заканадаўства, прававой вызначанасці, забеспячэнне зразумеласці прававых прадпісанняў і прадказальнасці для грамадзян прававых наступстваў сваіх дзеянняў — значныя фактары забеспячэння канстытуцыйнай законнасці.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што палажэнні Канцэпцыі прававой палітыкі Рэспублікі Беларусь, зацверджанай Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2023 г. № 196, служаць каштоўнасна-прававым арыенцірам для далейшага развіцця ўсёй нацыянальнай сістэмы заканадаўства і практыкі яго прымянення, у адпаведнасці з якімі ў аснове штодзённай дзейнасці дзяржаўных органаў і службовых асоб павінны знаходзіцца чалавек, яго канстытуцыйныя правы, свабоды і законныя інтарэсы.

3. Ва ўмовах сучаснага тэхнагенна-лічбавага грамадства пашыраюцца магчымасці прымянення навукова-тэхнічных інавацый у розных сферах, уключаючы выкарыстанне штучнага інтэлекту (у тым ліку нейрасетак). Пры гэтым вельмі важна забяспечваць своечасовае нарматыўна-прававое рэгуляванне далейшага развіцця інфармацыйна-лічбавай прасторы, якое адпавядае стандартам канстытуцыйнага вымярэння, а таксама ўлічвае прынцыпы навуковага прагназавання наступстваў прыняцця адпаведных актаў заканадаўства.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што пры фарміраванні лічбавага права неабходна стварэнне гнуткай сістэмы заканадаўчай рэгламентацыі, якая стымулюе развіццё тэхналогій штучнага інтэлекту і робататэхнікі, але пры гэтым гарантуе бяспеку, правы і свабоды чалавека.

4. Палажэнні абноўленай Канстытуцыі аб ажыццяўленні дэмакратыі ў Рэспубліцы Беларусь на аснове ідэалогіі беларускай дзяржавы, а таксама разнастайнасці палітычных інстытутаў і поглядаў грунтуюцца на канстытуцыйна-прававой дактрыне суверэнітэту і незалежнасці Рэспублікі Беларусь і з'яўляюцца заканамерным адлюстраваннем аб'ектыўнага гістарычнага працэсу развіцця беларускай дзяржаўнасці.

Канстытуцыйны Суд адзначае, што ідэалогія беларускай дзяржавы заклікана напоўніць глыбокім светапоглядным зместам далейшы суверэнны вектар развіцця грамадства і дзяржавы, які як выражае сучасныя грамадскія ідэалы і волю народа, так і адлюстроўвае нацыянальныя культурна-гістарычныя традыцыі і каштоўнасці.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што неабходна выпрацоўка эфектыўных прававых механізмаў, якія забяспечваюць рэалізацыю палажэння Канстытуцыі аб ідэалогіі беларускай дзяржавы ў мэтах процідзеяння насаджэнню чужой і разбуральнай для нашага грамадства сістэмы ідэй і псеўдакаштоўнасцяў.

5. Права на падачу канстытуцыйнай скаргі ўяўляе сабой спецыяльны від звароту для абароны правоў і свабод чалавека і грамадзяніна канстытуцыйным правасуддзем, праява комплексу канстытуцыйных правоў, уключаючы права на судовую абарону, права на ўдзел у кантролі за заканатворчым працэсам.

Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу, што ўстаноўлены заканадаўчы механізм рэалізацыі права грамадзян на зварот у Канстытуцыйны Суд са скаргай аб праверцы канстытуцыйнасці нормаў закона, прымененых у канкрэтнай судовай справе, патрабуе належнага юрыдычнага афармлення, атрымання кваліфікаванай юрыдычнай дапамогі.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што для дзейснага функцыянавання інстытута канстытуцыйнай скаргі неабходна ва ўстановах вышэйшай адукацыі пры падрыхтоўцы юрыстаў праводзіць спецыяльны навучальны курс «Канстытуцыйнае правасуддзе: інстытут канстытуцыйнай скаргі» і ўвесці пэўную спецыялізацыю ў сістэме адвакатуры.

6. Прававая асвета грамадзян, фарміраванне іх правасвядомасці і прававой культуры з'яўляецца доўгачасовым і прыярытэтным кірункам дзяржаўнай прававой палітыкі.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што патрэбна сістэмна працягваць работу па папулярызацыі і растлумачэнні палажэнняў Канстытуцыі ў працоўных калектывах, навучальных установах, сярод усіх слаёў насельніцтва з мэтай фарміравання паважлівага стаўлення да Асноўнага Закона краіны, ведання сваіх канстытуцыйных правоў, свабод і абавязкаў, а таксама разумення неабходнасці няўхільнага выканання канстытуцыйных нормаў у сваім штодзённым жыцці і прафесійнай дзейнасці. У гэтых мэтах належыць выкарыстоўваць Навукова-практычны каментарый да Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, падрыхтаваны высокакваліфікаванымі юрыстамі, у тым ліку суддзямі і супрацоўнікамі Канстытуцыйнага Суда.

7. Абноўленая Канстытуцыя і прыведзеныя ў адпаведнасць з ёй законы і іншыя нарматыўныя прававыя акты сфарміравалі прававую аснову для далейшага ўстойлівага і дынамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай.

На дасягненне канстытуцыйных мэт павінны быць накіраваны намаганні не толькі дзяржаўных органаў, але і грамадскіх арганізацый і грамадзян, якія добрасумленна і свядома рэалізуюць свае канстытуцыйныя правы і выконваюць канстытуцыйныя абавязкі.

Канстытуцыйны Суд, забяспечваючы вяршэнства Канстытуцыі, сваёй дзейнасцю абараняе канстытуцыйны лад, правы і свабоды чалавека і грамадзяніна, уносіць уклад ва ўмацаванне канстытуцыйнага правапарадку ў краіне.

Гэта Пасланне прынята на пасяджэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь 5 сакавіка 2024 г.

Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь П. П. МІКЛАШЭВІЧ.

Анатоль ЯРМОЛЕНКА:

«НАС НАТХНЯЕ БЕЛАРУСКАЯ ПАЭТЫЧНАЯ КЛАСІКА»

«Добрыя людзі тут недалёка,
Добрыя людзі, з вамі так лёгка...»

Душэўная мелодыя, прыгожы і пазнавальны голас спевака... Мы сустрэліся з народным артыстам Беларусі Анатолем Ярмоленкам, мастацкім кіраўніком і салістам ансамбля «Сябры», падчас яго творчай вечарыны ў мінскай гімназіі № 75 імя Масленікава. Выглядала сімвалічна: вядомы спявак не адгароджваецца пафасам і гламурам, наадварот, для яго важна быць сярод людзей, і людзі розных пакаленняў адказваюць на шчырасць артыста шчырай жа любоўю. Нездарма на пытанне, што для яго Беларусь, Анатоль Ярмоленка адказаў словамі песні — «Я ўдзячны лёсу, што з усіх краёў ён выбраў для мяне навекі гэты...»

Пытанняў падчас сустрэчы было шмат, сярод іх традыцыйна пра сакрэт поспеху... Анатоль Ярмоленка адказаў проста: «Заўсёды трэба шчыра рабіць сваю працу. Урэшце, усё залежыць ад гледача. Глядач не церпіць фальшу. Так, ёсць папулярная музыка, якая «для ног», якая «ніжэй пояса». Але нашы песні — яны сэрца, душа і думкі». Папярэдзіў маладых не купляцца на абяцанні рознага кшталту дзялкоў, якія прапануюць зрабіць зорку з любой дзяўчынкі ці хлопчыка, толькі грошы давай... Так, можна запісаць з дапамогай тэхналогій папулярную песню, чалавек робіцца вядомым, і яму здаецца, што ўсё каля яго ног. Таму часам учынкі маладых артыстаў такія легкадумныя, і артысты гэтыя хутка злятаюць з вышыні.

— Бо ўтрымаць на вышыні можа прафесіяналізм і тое, што ідзе з душы, — прызнаўся артыст. — Прайсці медныя трубы — самае цяжкае, калі цябе ўвесь час хваляць... Я, калі чую ўхвалы, пачынаю нібыта нешта з сябе страсаць... Пытаюцца: «Што такое?» «Бронзу» з сябе страсаю, каб не забранзавець», — адказваю я. Таму што вельмі лёгка стаць помнікам... А я проста чалавек. Глядач сам сабе прыдумвае пра «мэтраў», напэўна, так яму цікавей. А артысту не трэба зазнавацца. Чым вышэй ты падымаешся, тым болей цябе хістае, ты знаходзішся пад пільнымі поглядамі многіх, і трэба ўмець выстаяць, не звяртаючы ўвагі на хейтэраў. Бо як толькі пачнеш адказваць на закіды тых, хто цябе спецыяльна правакуе, становішся на адзін узровень з тымі, хто цябе хоча зачапіць. А яны, акрамя гэтага, больш нічога не ўмеюць. Творчыя людзі розныя. Калісьці мне здавалася, што кампазітар, які напісаў такую прыгожую песню, ці паэт, аўтар такога выдатнага верша — гэта жыхары неба, анёлы... Зусім не. Таленавітыя людзі розныя бываюць. Ёсць талент, а ёсць характар чалавека. І асуджаць іх я не раю.

Прагучала пытанне і пра сумесныя праекты са спеваком Дэмісам Русасам, якога называлі «містар сто тысяч вольтаў». Анатоль Ярмоленка вельмі любіў творчасць гэтага артыста і, калі рыхтаваў свой юбілейны канцэрт, рызыкнуў з ім звязацца, даслаў свае запісы... І нечакана атрымаў адказ: «Ок, я прыеду і спяю на вашым канцэрце гэтую песню». Выбраў для выканання, вядома, «Алесю». Запіс таго сумеснага выступлення можна паглядзець на youtube-канале «Сябры», у якога больш чым сто тысяч падпісчыкаў. Дэмісу Русасу спадабалася, як беларускі артыст працуе; дамовіліся, што запросіць Анатоля Ярмоленку на свой сольны канцэрт, потым — у сумеснае турнэ... Але Русас захварэў і памёр.

У размове з залай Анатоль Ярмоленка параіў час ад часу прыпыняцца і задумвацца:

— У мітусні мы забываем вельмі важныя рэчы. Я намагаюся нагадваць пра тое, што як бы ні спяшаўся чалавек, трэба знаходзіць час для тых, хто з табой побач. Пагаварыць з бабуляй, з маці, з каханай жанчынай... Пасля пачынаеш шкадаваць, што гэтага не зрабіў, а ўжо нічога не вернеш. У мяне шмат на гэтую тэму ёсць песень.

«Сябрам» у гэтым годзе — пяцьдзясят гадоў. Таму часам на іх канцэрты прыходзяць мамы з дочкамі Алесямі, названымі ў гонар песні «Алеся». Другая культавая песня «Сяброў» — гэта «Вы шуміце, шуміце нада мною, бярозы» на словы Ніла Гілевіча.

— Прыязджаем куды-небудзь на гастролі — публіка просіць «Давай «лягу-прылягу», — з усмешкай успамінае спявак. — Запала гэта песня ў сэрца народа не толькі на Беларусі... Памятаю, у Афрыцы выступалі, і там гледачы, сярод якіх былі колішнія студэнты, што вучыліся ў Беларусі, дружна падпявалі. Ніл Сымонавіч Гілевіч калісьці казаў мне, што бацька такой папулярнасці песні, бо яна не застольная, хоць яе пяюць за сталом. Гэта пра Радзіму, як чалавеку родная зямля надае сіл. Мы выступалі калісьці ў Афганістане, і я атрымаў ліст ад байца, які ляжаў, цяжкапаранены, у шпіталі. Ён жыць не хацеў... Але пачуў па радыё наша выступленне: «Вы мяне вылечылі гэтай песняй, бо ў ёй закладзена прага жыць і рухацца наперад».

Напрыканцы сустрэчы з гімназістамі прагучалі вядомыя песні, у тым ліку «Алеся», а галасы птушак, з якіх яна пачынаецца, аказваецца, насвіствае сам Анатоль Ярмоленка, і так праўдападобна, што, калі не пабачыш, не паверыш, што гэта не сапраўдныя птушкі.

— Я шчаслівы чалавек, які дажыў да праўнукаў, — звярнуўся да юных слухачоў Анатоль Іванавіч. — Вы ў нечым разумнейшыя за нас, больш «прасунутыя». Адзінае — занадта захапляецеся інтэрнэтам, а там трэба інфармацыю «фільтраваць», там шмат несумленных блогераў, якім вы верыце болей, чым дзяржаўным СМІ. Але калі вы падрасцеце і ў вас будуць свае дзеці, вы іх будзеце выхоўваць на нашых песнях, таму што яны грэюць душу. Хоць і я магу праспяваць любую песню, і вы можаце захапляцца рознымі выканаўцамі, але любіць трэба песні роднай зямлі.

Творчая сустрэча завяршылася, а гімназісты яшчэ доўга фатаграфаваліся з зорным госцем, бралі аўтографы... Знайшоўся час і для нашай гутаркі з Анатолем Ярмоленкам.

— Анатоль Іванавіч, у вашай творчасці адчуваецца моцная традыцыя беларускай народнай песні. Калісьці Уладзімір Караткевіч распавядаў, якое ўражанне на яго зрабіла сустрэча з Рыгорам Шырмам: «І адразу выяснілася, якая велічная рэч наша песня». Ці былі ў вас такія сустрэчы?

— Безумоўна, традыцыі беларускай народнай песні для нас важныя, хоць народных песень мы не спяваем. Мы выхоўваліся на апрацаваных Мулявіным беларускіх народных песнях, захапляліся імі, але, каб не быць падобнымі да «Песняроў», звярнуліся да аўтарскай песні. Нас натхняе беларуская літаратурная класіка. І Караткевіча я вельмі шаную, і п'есамі Купалы натхняўся: і «Паўлінкай», і «Тутэйшымі». Зрабіла ўражанне знаёмства з Рыгорам Барадуліным, ён нават падараваў мне кнігу з дарожным надпісам, у якім быў радок «Я люблю Ярмоленку». Зрэшты, сустрэчы з многімі беларускімі паэтамі сталі важнымі і плённымі. І з Віктарам Шніпам — мы выконвалі на яго словы песні «Усе мы родам з дзяцінства» і «Вяртайся дадому», і з Алесем Бадаком — зараз вялікай любоўю ў гледачоў карыстаецца песня на яго словы «Добрыя людзі». Шмат песень на словы Леаніда Дранько-Майсюка, Леаніда Прончака. Адна з цудоўных песень апошняга часу на словы Прончака — «Прызнанне», пра любоў да Беларусі, я выконваў яе падчас Дня адзінства 17 верасня на «Мінск-арэне», і ўся вялікая зала дружна ўстала. Аўтар слоў песні «Прыязджайце да нас у Беларусь» Іван Юркін вельмі цікавы чалавек, ён паэт і — генерал.

— Якім крытэрыям павінна адпавядаць слова, якое з'яднаецца з музыкай, ці можа быць, што верш кепскі, а музыка добрая? Ці верш — выдатны, глыбокі, а праспяваць яго немагчыма?

— Я заўсёды звяртаў увагу першым чынам на верш, на тэкст. Калі я яго зразумею, ён мне адгукнецца, я папрашу кампазітара напісаць музыку. І калі кампазітар зразумее, што я ўбачыў у гэтым вершы, і пранікнецца глыбінёй паэзіі, мне будзе лягчэй выконваць песню і даносіць да слухача. Я — гэта ўжо «фінальная інстанцыя» стварэння песні. Я не бяру вершы, якія мне не падабаюцца. І калі вершы глыбокія, мы перарабляем пад іх мелодыю, каб была арганіка.

— Цікава, бо звычайна ж бязлітасна перарабляюць менавіта вершы пад мелодыю... Ці даюць паэту «рыбу», на якую ён мусіць нешта напісаць...

— Усё ж такі я лічу, што «спачатку было Слова»... Я працую не з тэкстамі, а з паэзіяй. Вельмі складана іншым разам на выдатныя вершы паэта напісаць мелодыю, бо там ёсць думка, яе не перастаўіш, не падрыфмуеш іначай пад мелодыю. І таму мелодыя павінна ісці за вершам. Прыемна, што цяпер мы працуем з кампазітарам Алегам Елісеенкавым, які адчувае мелодыку верша.

— Вельмі важная пазіцыя на фоне агульнай тэндэнцыі да спрошчання ў сучасным мастацтве, арыентаваным на шырокую публіку... Паэт-песеннік Дзербянёў наракаў, што тэксты на эстрадзе спрасціліся да таго, што рыфмуецца «ботинок» і «полуботинок»...

— Так, моладзь слухае часам тое, дзе ўвогуле тэкст не мае сэнсу: «ла-ла-ла», «ідзі сюды», «ідзі сюды» і досыць. Спявак павінен быць начытаным у паэзіі, мець літаратурны густ. І мець маральнае права выказваць тое ці іншае. Часам слухаю — і песня добрая, і мелодыя прыгожая, і словы глыбокія, а выканаўца яе не разумее. Ён выстаўляе наперад сваё «я», не пранікаецца ні паэзіяй, ні мелодыкай, і таму гэта не знаходзіць водгуку. Вядома, гэткае разуменне з гадамі прыходзіць. А можа, і не прыйдзе... Не кожнаму дадзена. З'яўляюцца выканаўцы, якія запісалі некалькі песень — і ўжо сольны канцэрт адразу. А глядач паслухаў трохі — і яму нецікава, яму ўжо трэба гульня святла, танцы, усе гэтыя «рукі вышэй». Сольны канцэрт трэба рабіць, калі ўжо ёсць вопыт, уменне размаўляць з гледачом. Безумоўна, у сольнай праграме трэба закладваць выхаваўчую функцыю: я распавядаю пра нашу зямлю, пра Радзіму, пра маці, пра тое, што робіць нас людзьмі, — гэта аснова нашай творчасці. А ў канцы, па заяўках, можа быць шоу, нешта забаўляльнае. А заканчваю песняй, у якой гаворыцца: прыязджайце ў Беларусь, паглядзіце, што за людзі тут жывуць, каб зразумець іх і палюбіць нашу краіну.

— Кажуць, што мова — не проста інструмент, яна мае ўласную ментальнасць, якая ўплывае на тых, хто ёю карыстаецца. Што для вас — спяваць менавіта на беларускай мове?

— Калі спяваеш на беларускай мове, адчуваеш — ты грамадзянін сваёй краіны, ты ганарышся гэтым. Ганарышся, што ў нас ёсць і мова, і герб, і гімн, і сцяг, і дзяржаўнасць, нягледзячы ні на якія абставіны. А беларуская паэзія павінна дапамагаць такому ўсведамленню, выхоўваць гонар за сваю Радзіму. Часам чую нараканні, што мова наша забываецца. Не забываецца! Моладзь, наадварот, зараз цікавіцца мовай. Дарэчы, больш паловы песень у нас на беларускай мове, і, калі выступаю ў Расіі, часта просяць выканаць песні менавіта па-беларуску. Мова наша прыгожая, спеўная, і дзе магу, я гэта паказваю. А іншым разам чую, як кажуць калегі: вось, просяць песню на беларускай мове, перакладзём з рускай на беларускую... Там не будзе той глыбіні, таму што нельга дакладна перадаць тое, што задумаў паэт, калі пісаў на беларускай мове.

— З аднаго боку, існуе паняцце піраміды мастацтва, на вастрыі якой эксперымент для нешматлікіх, які апускаецца ўніз і пашыраецца да шаблону... З другога — тое, што калісьці было ўсім даступным, робіцца элітным. Напрыклад, опера, якая сёння лічыцца жанрам не для знаўцаў, калісьці была ў Італіі народным жанрам — арыі спявалі ўсе, ад гандальера да гандляра...

— Бо не было «папсы»... А сёння з кожнай машыны такая даносіцца. FM-станцыі спрошчваюць музыку, спрошчваюць густ моладзі, і вырастаюць тыя, хто оперу не ўспрыме. Трэба знаходзіць спосаб,

каб уплятаць нешта вартае паміж тым масавым прадуктам, што круцяць FM, якія сёння дыктуюць моду на музыку. Нашы песні там «нефармат». Але ўсё роўна іх ведаюць, слухаюць, знаходзяць. Каб не страціць традыцыі, трэба вывучаць беларускую песню ў школе, нават каб у дзіцячым садку гучалі беларускія песні. Праўда, ужо і выхавацелі, і настаўнікі выхаваныя на іншай музыцы. Мы крыху прапусцілі гэта ў свой час, але цікавасць да добрай беларускай песні аднаўляецца. Зараз мы едзем у Санкт-Пецярбург, там нас чакае зала на пяць тысяч гледачоў, і вось патэлефанавалі, што ставяць нам другі канцэрт на дзень, бо надта вялікі попыт.

— Наколькі для вас важна абараніць уласнае бачанне ад нечых уплываў?

— Да неабходнасці такой абароны прыходзіш толькі з часам. Напачатку я чуў столькі парад наконт таго, якой павінна быць мая творчасць, — і ў Гомельскай абласной філармоніі, і ў Мінску... Хацелі з нас нейкі дыксіленд, помню, зрабіць. Казалі, ёсць «Песняры», і хопіць падобнага... Але я ішоў заўсёды сваім шляхам. Урэшце, з 1991 года мы знаходзімся на самафінансаванні, усе інструменты, касцюмы набываем за свае сродкі. Здараліся і цяжкія перыяды: калі пачаўся каранавірус, не было канцэртаў. Тады мне нават сваю машыну давялося прадаць, каб падтрымаць нашу дзейнасць. Але ў нас заўсёды былі поўныя залы. Я выконваю тыя песні, якія людзям патрэбныя, на нашых песнях выхоўваюцца. Я лічу, што павінен быць гонар за сваю дзяржаву. Калі я знаходзіўся ў журы міжнародных конкурсаў, здзіўляўся: выступае прадстаўнік якой-небудзь маленькай афрыканскай краіны, прыйшлі некалькі яго землякоў, і яны ўсю залу заводзяць, калі выступае іх выканаўца. А нашы артысты не заўсёды такую падтрымку сустракаюць, часам мы лепей прымаем гасцей, чым уласных артыстаў. А трэба любіць сваё, бараніць сваё, даражыць сваім.

«У мітусні мы забываем вельмі важныя рэчы. Я намагаюся нагадваць пра тое, што як бы ні спяшаўся чалавек, трэба знаходзіць час для тых, хто з табой побач. Пагаварыць з бабуляй, з маці, з каханай жанчынай... Пасля пачынаеш шкадаваць, што гэтага не зрабіў, а ўжо нічога не вернеш. У мяне шмат на гэтую тэму ёсць песень».

— Я ведаю, што тэма Вялікай Айчыннай вайны вас заўсёды хвалявала. Што рыхтуеце да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў?

— Тэма Вялікай Айчыннай вайны і Перамогі для мяне заўсёды будзе актуальнай. На гэтую тэму ў нас напісана столькі песень... Сярод іх шмат на музыку Ігара Лучанка і Эдуарда Ханка — калісьці канцэрт з іх песень мы назвалі «Мы прыйшлі з Перамогай». Рыхтуем з цудоўным кампазітарам Валерыем Галаўко праграму «Тры Іваны», пра тое, што аб'ядноўвае народы, якія разам прыйшлі да Вялікай Перамогі. Рыхтуецца праграма «Перамога», у якой прагучаць і ўсім вядомыя, любімыя слухачамі песні, і новыя. Запісаў на радыё песню на музыку Валерыя Іванова і словы Аляксандра Лягчылава «Вас осталось немного, переживших войну». І сапраўды, няшмат засталося такіх людзей... І трэба навучыць дзяцей і ўнукаў шанаваць гістарычную памяць.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

НОВЫЯ ГРАНІ І НОВАЯ ЯКАСЦЬ

Сталі вядомыя пераможцы 63-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі»

Найлепшыя праекты кніжных выдавецтваў атрымалі заслужаныя ўзнагароды па выніках 63-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі».

За перамогу змагаліся 35 выдавецтваў рознай формы ўласнасці і больш за 150 выданняў. Выбраць было няпроста, аднак кампетэнтнае журы, у склад якога ўваходзілі прадстаўнікі прафесійных колаў мастацтва і дзяржаўных органаў на чале з **рэктарам БДАМ Міхаілам БАРАЗНОЙ,** зрабілі свой выбар.

— Мне асабліва прыемна прысутнічаць на гэтай сцэне сярод людзей, якія зацікаўлены ў тым, каб інтэлектуальная культура развівалася ў рамках такой традыцыйнай формы, як кніга, — заявіў на ўрачыстай цырымоніі ўшанавання пераможцаў Міхаіл Баразна. — Гэта конкурс, які дэманструе з году ў год новыя грані і новую якасць. І на сёння, акрамя прыгожых ілюстрацый, выдатных фатаграфій і дызайну, мы разглядаем кнігу як сур'ёзны прадукт, таму кожны год ускладняюцца крытэрыі ацэнкі.

Таксама на мерапрыемстве прысутнічаў **намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ,** які разам з рэктарам БДАМ уручыў дыпломы і бронзавыя статуэткі пераможцам. Ён падкрэсліў значнасць таго, што конкурс ахоплівае шырокае кола прафесіяналаў.

— Калі заходжу ў нашы выдавецтвы і бачу статуэтку Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», разумею: гэта знак якасці, тут працуюць прафесіяналы, на іх можна разлічваць, — дадаў ён. — Сёння ў нас ёсць магчымасці, каб конкурс пашыраўся. Гэта паспрыяе таму, каб якасныя кнігі, якія атрымліваем, станавіліся ўсё больш значнымі на міжнароднай арэне.

Не будзем стамляць і адразу скажам, хто атрымаў Гран-пры «Трыумф». Яго ўдастоілася кніга «Прысмак каляровых рэвалюцый», плён Выдавецкага дома «Беларусь сегодня», аналітычнага цэнтра ECOOM і выдавецтва «Беларусь». Гэта выданне ўяўляе сабой унікальны міжнародны аналітычны праект, напоўнены разважаннямі вядучых палітолагаў, аналітыкаў і публіцыстаў з розных краін свету на тэму феномена «каляровая рэвалюцыя».

Не застаўся без узнагарод і Выдавецкі дом «Звязда». Ён удастоіўся дыплома пераможцы ў спецыяльнай намінацыі «Садружнасць» за выданне кнігі «Сугучча», дыплома першай ступені ў тэматычнай намінацыі «Дзецям XXI стагоддзя» за выданне кнігі «Цуд-ягада», спецыяльнага дыплома ў тэматычнай намінацыі «ЛІТ-фармат» за выданне кніг Мікалая Чаргінца «Цяжкія дарогі жыцця», «Трывожныя дні» і шэрагу дыпломаў іншай ступені ў розных намінацыях.

Таксама сярод пераможцаў конкурсу — «Тарас на Парнасе» выдавецтва «Мастацкая літаратура» (укладальнік Віктар Шніп) у намінацыі «ЛІТ-фармат», два пераможцы ў намінацыі «За ўклад у захаванне гісторыка-культурнай спадчыны»: «Сімвалы беларускай вечнасці. Гісторыя сімвалаў беларускай дзяржаўнасці» Ігара Марзалюка выдавецтва «Беларусь» і «Шынуазры ў замках Радзівілаў XVIII стагоддзя. Раскоша ва ўсходнім стылі» Вольгі Бажэнавай ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа», «Казкі вялікага леса» Валерыя Кастручына выдавецтва «Народная асвета» ў намінацыі «Дзецям XXI стагоддзя» і многія іншыя. Найлепшым мастаком-ілюстратарам 2023 года стала Алена Карповіч, а найлепшым дызайнерам — Максім Шніп.

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

Містыка, прыгоды, важныя рэаліі...

Якія кнігі прадставілі на фінале літаратурнага стартапу LitUP

Фінал чацвёртага літаратурнага стартапу LitUP, які арганізаваны Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь, прайшоў на XXXI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы.

Гэты конкурс дае магчымасць пераможцам быць апублікаванымі вядучымі беларускімі выдавецтвамі. Так, ужо на гэтай выставе-кірмашы можна было знайсці на паліцах кнігі фіналістаў трэцяга стартапу.

Сёлета журы трэба было выбраць каля 20 самых лепшых аўтараў з больш чым 200 работ. Сярод фіналістаў была Валянціна Быстрымовіч, два рукапісы якой будуць апублікаваны ў Выдавецкім доме «Звязда».

— Першая кніга — містычная, пад назвай «Тупат мяккіх лапак», — падзялілася пісьменніца. — Спачатку сумнявалася, пісаць мне «містыку» ці не, таму вырашыла задаць пытанне падчас сустрэч з чытачамі: ці здараліся з вамі гісторыі, якія вы лічыце містычнымі? Самае цікавае, што ўсе да аднаго паднялі рукі. Таму я вырашыла, што гэта кніга будзе цікавая.

Другая кніга — раман «І ўсё ж я яго пацалую». Галоўная гераіня, гарэзная і трохі адчайная жанчына гадоў 40, адпраўляецца ў ААЭ дапамагаць сям'і дачкі даглядаць маленькае дзіця. І там з ёй адбываюцца розныя прыгоды — ад добрага і кранальнага сяброўства да амаль шэкспіраўскіх жарсцяў.

Таксама хутка Выдавецкі дом «Звязда» апублікуе і кнігу Людмілы Кебіч «Чароўны куфэрак часу» для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту.

Пісьменніца прызналася, што для яе напісанне гэтага твора было нечым дзіўным.

— Па жыцці я паэтэса і дзіцячыя кніжкі таксама пісала вершаваныя. Але тут да мяне прыйшло азарэнне: я ўявіла сабе цэлае кіно і напісала гэту кнігу, — прызналася Людміла Кебіч.

Атрымалася апавяданне з элементамі фэнтэзі. Па сюжэце праўнучкі Яначка і Сафійка прыязджаюць на зімовыя канікулы да сваёй прабабулі Веры і заўважаюць там вялікі куфар, заслонены канапай і прыкрыты вышываной дарожкай. Але ж прабабуля вельмі строга забараніла адчыняць яго. Вядома, гэта не магло спыніць дзяўчат, і, калі прабабуля сышла ў краму, яны залезлі ў яго. Куфар зачыняецца, і адбываецца сапраўдны цуд: яго дно адзялілася і паплыло ўніз, а дзяўчаты апынуліся ў мінулым 100-гадовай даўніны.

Цікава, што ў творы чытачы праз розныя прыгоды галоўных гераінь знаёмяцца з беларускай культурай, у тым ліку і з азбукай беларускага арнаменту.

Уразіла таксама і прэзентацыя Вікторыі Кляўко. Яе раман «Вырай» будзе апублікаваны ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

— Хацелася расказаць гісторыю пра вяртанне ў свой дом. Мая галоўная гераіня 17 гадоў таму эмігравала ў Германію ў пошуках лепшага жыцця. Прафесійна яна рэалізавалася, але асабістае жыццё, на жаль, не склалася, — расказала пісьменніца. — На парозе свайго 50-годдзя яна вымушана вярнуцца ў родную вёску на поўначы Беларусі і праводзіць сваю маці ў апошні шлях. Там яна сутыкаецца з тым мінулым, ад якога так старалася ўцячы, шмат чаго пераасэнсоўвае і ў выніку вяртаецца ў Беларусь, бо разумее, што яе месца тут.

Чырвонай ніткай ідуць тэмы любові да радзімы і адраджэння вёскі, што з'яўляецца вельмі блізкім для самой Вікторыі Кляўко.

— Я выкупіла дом сваіх прабабулі і прадзядулі, планую займацца рэстаўрацыяй, каб стварыць там радавое гняздо, — падзялілася пісьменніца.

Але ж галоўная думка твора ў тым, што без любові не выжыць, бо чалавек прыйшоў у гэты свет, каб навучыцца любіць.

Даволі актуальным гучаў з'яўляецца і дэтэктыў Ганны Альхоўскай «Пустэча ў вачах таго, хто глядзіць», які распавядае пра небяспекі сусветнага павуцення.

Па словах пісьменніцы, ахвярай злачынства неабавязкова можа стаць той, хто ідзе цёмнай ноччу па вуліцы, ці той, каго хочуць абрабаваць; ахвярай злачынства можа стаць любы чалавек, які «завісае» ў інтэрнэце.

— Вы вельмі шмат пра сябе туды выкладваеце. Нават калі выдаліце, гэта нікуды не знікае. Бо інтэрнэт — гэта сусветнае павуцінне, а ў павуцінні заўсёды ёсць павук. І калі хакер захоча зламаць ваша жыццё, ён гэта зробіць, — дадала Ганна Альхоўская.

Атрымліваецца, карыстацца дабротамі цывілізацыі вельмі зручна, але рабіць гэта трэба ўсё ж такі з асцярожнасцю.

У лік фіналістаў, творы якіх будуць апублікаваны ў Выдавецкім доме «Звязда», таксама ўвайшлі Андрэй Дарожкін, Іна Зарэцкая, Ганна Сяўбо, Тамара Кавальчук, Наталля Кандрашук і Таццяна Сучкова.

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390
Продавец	Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, УНП 400395996
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронных торгов
Адрес: Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, ул. Ленинская, 6-1

Административное помещение № 1 – 746,8 кв. м
(инв. номер 331/D-1317, составные части и принадлежности: электроснабжение, теплосеть, водопровод, канализация)

***Обременение*:** площади помещения сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

Начальная цена лота без НДС – 88 621,45 бел. руб.
(снижена на 80 %)

Шаг электронных торгов составляет 5 % от начальной цены предмета электронных торгов

Порядок осмотра:
по предварительному согласованию в рабочие дни с 8.30 до 17.15 – Симанович Зинаида Юльевна, +375 29 607-08-25

Задаток **17 724,00 бел. руб.** перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. По письменному заявлению покупателя может быть предоставлена рассрочка оплаты стоимости имущества на срок до 3 лет с ежемесячной индексацией платежей согласно договору купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by, с соблюдением требований, установленных Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики от 12.07.2013 № 608 «О проведении электронных торгов» (в ред. постановления Совмина от 01.12.2023 № 846).
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by.
Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи предмета электронных торгов, указанной в протоколе о результатах электронных торгов, либо в протоколе о признании электронных торгов несостоявшимися, в случае согласия претендента на покупку на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 28.02.2024

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 05.04.2024 с 11.00 до 11.10.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 04.04.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
E-mail: auction@cpo.by

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Мётча Агро»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Капитальное строение с инвентарным номером 610/С-13137 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – контора, общая площадь – 1230,4 кв. м)	16 614,00	1 661,40	830,70
2	Витрина холодильная «Двина-120», инв. № 2218	4,32	0,43	0,22
3	Витрина холодильная «Двина-120», инв. № 2219	4,32	0,43	0,22
4	Витрина холодильная «Двина-150», инв. № 2207	3,12	0,31	0,16
5	Витрина холодильная «Двина-150», инв. № 2279	3,12	0,31	0,16
6	Витрина холодильная БПСН 1800, инв. № 1195	1,92	0,19	0,10
7	Витрина холодильная ВХЗ-1511,02, инв. № 1198	1,92	0,19	0,10
8	Холодильная витрина «Двина-150», инв. № 213	3,12	0,31	0,16
9	КЭС-20 воздухонагреватель на тв ВТ-6, инв. № 3265	1728,00	172,80	86,40
10	Агрегат дисковой универсальный АДУ-6, инв. № 1993	6696,00	669,60	334,80
11	Агрегат почвообрабатывающий посевной АПП-6Д, инв. № 3592	116316,00	11631,60	5815,80
12	Машина первичной очистки зерна МЗС-20, инв. № 3720	6480,00	648,00	324,00
13	Плуг полунавесной оборотный ППО-8-40 К, инв. № 3617	7668,00	766,80	383,40
14	Погрузчик с телескоп. стрелой «АМКОДОР 527 (ОК-5 0612)», 2010 г. в., инв. № 3618	72144,00	7214,40	3607,20
15	Распределитель минеральных удобрений РУ-7000, инв. № 1292	9072,00	907,20	453,60
16	Трактор «Беларус-320.4» (в пласт. облиц.) (ОК-5 0607), инв. № 3596	5184,00	518,40	259,20

В отношении лота № 1 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 70 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 204 (30084) от 20.10.2023, стр. 14, № 237 (300967) от 07.12.2023, стр. 14, № 254 (300984) от 30.12.2023, стр. 10, № 13 (300997) от 19.01.2024, стр. 14, № 27 (301011) от 08.02.2024, стр. 6, № 43 (30177) от 29.02.2024, стр. 14. В отношении лотов №№ 2–8 проводятся одиннадцатые повторные торги. **Стоимость снижена на 99 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 69 (29949) от 12.04.2023, стр. 15, № 103 (29983) от 01.06.2023, стр. 11, № 125 (30005) от 01.07.2023, стр. 6, № 141 (30021) от 25.07.2023, стр. 14, № 185 (30065) от 23.09.2023, стр. 15, № 222 (300952) от 16.11.2023, стр. 4, № 237 (300967) от 07.12.2023, стр. 14, № 254 (300984) от 30.12.2023, стр. 10, № 13 (300997) от 19.01.2024, стр. 14, № 27 (301011) от 08.02.2024, стр. 6, № 43 (30177) от 29.02.2024, стр. 14. В отношении лота № 9 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 13 (300997) от 19.01.2024, стр. 14, № 43 (30177) от 29.02.2024, стр. 14. В отношении лотов №№ 10–16 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 24 (30158) от 03.02.2024, стр. 10

Местонахождение лота № 1: Минская обл., Борисовский р-н, Мётченский с/с, д. Большая Ухолода, ул. Элькинда Виктора, 18.
Местонахождение лотов №№ 2–16: Минская обл., Борисовский р-н, Метченский с/с, вблизи д. Старая Мётча.
GPS-координаты: 54.179354, 28.711073

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 620884802101000733 площадью 0.5361 га, для строительства и обслуживания конторы. Право аренды до 08.01.2073. Имеются ограничения (обременения) на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 84 га, ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения), код – 2,7, площадь – 0,5361 га

Лоты №№ 10–16 имеют обременения в виде лизинга. Вопросы по обременениям по тел. +375293110464 (Анастасия)

Дата и время проведения торгов	**1 апреля 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	С 10.00 19 марта 2024 года до 16.00 28 марта 2024 года

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Мётча Агро», проводимых 01.04.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375293042560.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

Информация о продавце	**ООО «Мётча Агро» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375293110464, 80173958917 (Минская обл., Борисовский р-н, Метченский с/с, д. Старая Метча, ул. Почтовая, д. 1, УНП 190564818)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, ☎ тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

ИЗВЕЩЕНИЕ О СНЯТИИ С ТОРГОВ

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)

СООБЩАЕТ О СНЯТИИ С АУКЦИОНА, назначенного на 03.04.2024, **автобуса PAZ 3205 D5 (бело-синего цвета, 2003 г. в., номер кузова (VIN) X1M3205D530009898, рег. знак АХ 8253-5).**

Продавец – ОАО «Молодечненский райагросервис».

Извещение о торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 29.02.2024.

УНП 600077381

УНП 193747461

Управляющая компания Общества с ограниченной ответственностью «Белабеддинг» – ООО «Экспресс технологии»

ОБЪЯВЛЯЕТ ОБ ОТМЕНЕ ОТКРЫТЫХ ТОРГОВ

по продаже имущества, принадлежащего Обществу с ограниченной ответственностью «Белабеддинг»

(объявленных ООО «Арбитр» в газете «Звязда» от 02.03.2024 на странице 15):

• грузового автомобиля платформы тентовой VOLKSWAGEN CRAFTER, 2009 г. в., цвет белый, рег. знак АК 7311-4, стоимостью 32 407,00 бел. руб. без НДС;

• автобуса марки MERCEDES BENZ SPRINTER CLASSIC 413 SBA 405504, 2017 г. в., цвет белый, рег. знак АК 4488-4, стоимостью 54 539,00 бел. руб. без НДС;

• вилочного погрузчика марки «DMB 1792», стоимостью 2 944,00 бел. руб. без НДС.

Дата, время и место проведения торгов: 05 апреля 2024 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, д. 127, корп. 5, каб. 411.

Справочная информация по телефону +375 29 190 20 75.

Информация о решениях, принятых на очередном общем собрании акционеров от 12.03.2024 г.

открытого акционерного общества

«ЭнКоСтрой»

(г. Минск, ул. Монтажников, 39-201)

По первому вопросу решили: утвердить отчет об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2023 г. и основных направлениях деятельности общества в 2024 г. Решение принято единогласно.

По второму вопросу решили: принять к сведению отчет совета директоров общества. Решение принято единогласно.

По третьему вопросу решили: принять к сведению отчет ревизионной комиссии общества. Решение принято единогласно.

По четвертому вопросу решили: утвердить бухгалтерскую отчетность ОАО «ЭнКоСтрой» за 2023 г. Решение принято единогласно.

По пятому вопросу решили: по итогам 2023 г. не производить распределение прибыли и дивиденды не начислять. Решение принято единогласно.

По шестому вопросу решили: делегировать полномочия совету директоров по определению в 2024 г. и первом квартале 2025 г. направлений использования чистой прибыли. Решение принято единогласно.

По седьмому вопросу решили: избрать членов совета директоров общества в количестве 6 человек согласно Уставу. Решение принято единогласно.

По восьмому вопросу решили: избрать членов ревизионной комиссии общества в количестве 2 человек согласно Уставу. Решение принято единогласно.

По девятому вопросу решили: установлено вознаграждение членам совета директоров и ревизионной комиссии. Решение принято единогласно.

УНП 191303197

Информация о решениях, принятых на очередном общем собрании акционеров от 12.03.2024 г.

открытого акционерного общества

«ЦентроСтройОфис»

(г. Минск, ул. Монтажников, 39-208)

По первому вопросу решили: утвердить отчет об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2023 г. и основных направлениях деятельности общества в 2024 г. Решение принято единогласно.

По второму вопросу решили: принять к сведению отчет наблюдательного совета общества за 2023 г. Решение принято единогласно.

По третьему вопросу решили: принять к сведению отчет ревизионной комиссии общества за 2023 г. Решение принято единогласно.

По четвертому вопросу решили: утвердить бухгалтерскую отчетность за 2023 г. Решение принято единогласно.

По пятому вопросу решили: по итогам 2023 г. не производить распределение прибыли и дивиденды не начислять. Решение принято единогласно.

По шестому вопросу решили: делегировать полномочия наблюдательному совету по определению в 2024 г. и первом квартале 2025 г. направлений использования чистой прибыли. Решение принято единогласно.

По седьмому вопросу решили: избрать членов наблюдательного совета общества в количестве 5 человек согласно Уставу. Решение принято единогласно.

По восьмому вопросу решили: избрать членов ревизионной комиссии общества в количестве 2 человек согласно Уставу. Решение принято единогласно.

По девятому вопросу решили: вознаграждение членам наблюдательного совета не выплачивать, установлено вознаграждение членам ревизионной комиссии. Решение принято единогласно.

УНП 191303207

ИЗМЕНЕНИЯ И ДОПОЛНЕНИЯ
В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,

опубликованную в газете «Звязда» от 18.05.2021 № 91 (29460) с дополнением и изменением в газете «Звязда» от 01.07.2021 № 123 (29492), от 04.08.2021 № 147 (29516), от 30.04.2022 № 84 (29706), от 08.11.2022 № 219 (29841), от 27.05.2023 № 100 (29980), от 21.10.2023 № 205 (30085), от 27.01.2024 № 19 (301003) и газете «Республика» от 06.05.2023 № 83 (8218).

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, **для долевого строительства жилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске** на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

Информация о застройщике:

общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 7А/1-82, офис № 1503, телефон/факс: +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 18.05.2021 № 91 (29460), следующие изменения и дополнения:

Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:

начало строительства – апрель 2019 года;

окончание строительства – июнь 2024 года.

Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома: 15.06.2024 года.

Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:

- 1 (одна) однокомнатная квартира № 186 общей площадью по проекту 53,1 кв. метра. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1700 долларам США при оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежей;

- 1 (одна) однокомнатная квартира № 57 общей площадью по проекту 43,5 кв. метра. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1700 долларам США при оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежей;

